Пролетары ўсіх краеў, злучайцеся!

8 сакавіка

Беларуская работніца і сялянка



Лютый
№ 2
1928

В феврале годовым и полугодовым подписчикам 1927 года будет разослана БЕСПЛАТНО БИБЛИОТЕЧКА.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА.

П. Відмонт — Выслаць спэцыяльна для гуртка выкрайку ня можам; мы высылаем выкрайку толькі як дадатак да часопісі для ўсіх падпісчыкаў. Некаторыя матар'ялы вашага пісьма выкарыстоўваем, як заметкі.

Б. Ліпкінай, Р. Ліпак, З. Новінкавай — Аўтабіяграфіі друкаваць ня будзем. Просім пісаць аб жыцьці і быце работніц фабрыкі.

Потехиной—Отзыв о „Моднице"—печатаем. Заметку о Городском Делегатском собрании—не будем: мысли высказываете хорошие, но они уже не новы и поэтому для журнала неинтересны.

Ф. Свинкиной—Заметку о помощи делегаток китайским революционерам не помещаем, не имеет особой ценности, потому что нет ничего практического. Вы пишете, что собирали пожертвования, а сколько собрали, а что дарили—об этом ни слова.

О. Дзянісевіч — „Актыўнасьць дэлегатак"—ня пойдзе. Пішэце, як дэлегаткі ўдзельнічаюць у кампаніі хлебазагатовак, у распаўсюджваньні пазыкі узмацненьня і колектывізацыі сялянскай гаспадаркі.

С. Кублицкой—Заметку о делегатском собрании печатаем. Стихи „Прежде и теперь"—не будем. Тема эта, конечно, не устарела, но требует более углубленной проработки. Пользоваться сравнением, как поэтическим приемом в отношении данной темы—сейчас уже старо и не вызывает никакого интереса.

Каплан—(Завод „Пролетарий") Воспоминания о Ленине опоздали. Пишите о культработе среди работниц, о работе делегаток на заводе, участии работниц в производственных совещаниях.

Кто соберет 10 подписчиков на „Беларускую Работніцу і Сялянку" и перешлет адреса, свой адрес, деньги в редакцию — будет получать бесплатно, как премию, журнал на столько месяцев, на сколько собрано подписчиков.

Деньги переслать можно и марками.

Н. Лифшиц, Руководителю Буйновичского Делегатск. Собрания—Номер журнала за январь вышел с некоторым опозданием (31 января) и мог к этому времени на места не попасть. Если он не получен и сейчас, напишите в редакцию или непосредственно в Контору Минской Почты.

Орлову—Стихи „Ночь под новый год"—печатать не будем. Вы пишите, что в эту ночь снилось старушке, замужней женщине и девице. Первой: „...Стройно, красиво, с цветком на груди, гордо пришлось ей на вечере бальном танец рекордно пойти „кабарди"... Ведь это в наши дни так неинтересно! „Свободной женщине"—тоже печатать не будем. Повторение перепетого.

Ржэвуцкаму—Разумеецца, рэдакцыя нічога супроць ня мае. Пішэце. Высьвятляйце на фактах, як расьце, удзельнічае ў будаўніцтве новай вёскі сялянка, батрачка. Верш друкаваць ня будзем.

Хобец, Елашевой—Ваш гонорар за ноябрь (и плату за фотогр. ясель „Двины" и санитарного кружка ж. д.)—выслали почтой на имя Оркженотдела.

Аршанскай, Каробкінай—Ваш ганарар за лістапад таксама выслан поштай.

Зайцевой, Каган, Тюфеевой, Гоницкой, Лондо, Старченко, Славиной—Ваш гонорар за декабрь месяц выслан Вам почтой (переводами).

М. Махнач — Наконт Вашай просьбы нічога ня можам дапамагчы, зьвярнецеся ў мясцовае аддзяленьне Саюзу Працасьветы.

К. Бяздольнаму і Жалезьнікаву—З Рэдакцыі часопісі „Полымя" нам перадалі Вашы апавяданьні: „Што бачылі дрэвы" і „У шляхты". Абоіх друкаваць ня будзем, для нашай часопісі не падыходзяць.

В. Гараўскаму — Апавяданьне „Адна, якіх многа" і лірычны верш у прозе „Пакахай",—атрымалі. Друкаваць ні таго, ні другога ня будзем, не падыходзяць. У Вас здольнасьць пісьменьніка адчуваецца. Верш падкуплівае сваёй апаляючай лірыкай і шырынёй размаху. Апавяданьне, праўда, троху слабей, не дапрацавана.

Николаевой (Орша) — Ваше заявление редакцией передано почте для расследования. О результатах сообщим, а пока редакция выслала 11 экземпляров декабрьского номера, которые были Вами не получены.

М. Лоханиной—Ответ Вам высылаем почтою.

М. Усавай — Сьпіс падпісчыкаў і грошы атрымалі. Выслалі Вам, як прэмію, два нумары за студзень. У лютым таксама высылаем. Просім і далей вербаваць падпішчыкаў.

П. Сярмязе, Н. Міхееву, В. Вітко, Трапашцы — Вашы апавяданьні атрыманы, але не прачытаны яшчэ. Пра іх—у чарговым нумары часопісі.

Насьці Бэзырка—Вашу заметку выкарыстоўваем. Пішэце і ўцягвайце сваіх таварышак. Старайцеся пісаць больш практычна. А то, напр., Вы пішэце: мы чуць ня ўсе падпісаліся на „Беларускую Работніцу і Сялянку", а колькі іменна Вас падпісалася—невядома.

М. Багуну, В. Вітко, П. Мініну— Вершы, дасланыя вамі, друкаваць ня будзем.

Р. Бачыла—Заметку пра Бардзілаўскіх сялянак зьмяшчаем. Вы пішаце, што нашу часопісь там ня выпісваюць. Вельмі добра будзе, калі Вы возьмеце на сябе ініцыятыву ў распаўсюджваньні „Беларускай Работніцы і Сялянкі".

Ц. Шыфрынсон — Чакаем ад Вас сьвежых допісаў аб жыцьці і працы дэлегатак, аб удзеле жанчын у галіне швэйнай вытворчасьці.

АБ ЧЫМ ПІСАЦЬ У НАСТУПНЫ НУМАР.

ПІШЭЦЕ—аб удзеле работніц у вытворчых нарадах, аб кваліфікацыі работніц, аб працы жонак рабочых у лавачных камісіях.

ПІШЭЦЕ—аб удзеле сялянак у кампаніі хлебазагатоўкі, у распаўсюджваньні пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі, аб жыцьці і працы сялянак у камунах, у колектыўных гаспадарках, аб працы дэлегатак-грамадчыц у галіне колектывізацыі сельскай гаспадаркі.

ПІШЭЦЕ—аб ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод работніц, жонак рабочых і сялянак.

ПІШЭЦЕ—як прайшло сьвяткаваньне 8-га сакавіка, аб 10-й гадавіне Чырвонай арміі.

1-я друкарня „БДВ". Зак. № 1.432. Тыраж 7.000. Галоўлітбел № 718.

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

Адрас рэдакцыі:
Менск, Савецкая вул., № 45
Тэлефон № 419

ОРГАН АДДЗЕЛУ РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК
ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ
КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

На 1 месяц	15 кап.
„ 3 „	45 „
„ 6 „	90 „
На год	1 р. 80 „

№ 2 (40) || Люты (февраль) 1928 г. || № 2 (40)

У дзень міжнароднай салідарнасьці працоўных жанчын—наша шчырае прывітаньне работніцам і сялянкам, усім працоўным жанчынам Беларусі!

ГОВ ИНСТИТУТ

Да Міжнароднага Камуністычнага Жаночага Дню.

10 гадоў сьвяткуюць працоўныя нашай краіны міжнароднае жаночае сьвята. Сьвяткуюць вольнымі, ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту, ва ўмовах зусім іншых, чым другія краіны. У краінах, дзе пануе капітал, камуністычныя партыі пры правядзеньні Міжнароднага Дню ставяць перад сабою асноўнай задачай—мабілізацыю жаночых мас дзеля барацьбы за ўладу, за дыктатуру пралетарыяту.

У нашай краіне, побач з міжнароднымі задачамі па ўмацаваньню сувязі з рабочай клясай, з працоўнымі жаночымі масамі зарубежных краін, асноўным зьместам сьвята зьяўляецца як мага шырэйшае ўцягненьне шырокіх мас працоўных жанчын у агульную работу па абароне і сацыялістычнаму будаўніцтву краіны.

У гэтым годзе асноўнай задачай сьвята зьяўляецца—растлумачэньне сярод жаночых працоўных мас практычных задач, высунутых партыяй на XV партзьезьдзе.

У горадзе, пры правядзеньні кампаніі, неабходна паставіць задачай уцягнуць работніц у работу па рацыяналізацыі вытворчасьці, па правядзеньню сямігадзіннага рабочага дню і зьніжэньню сабекошту прадукцыі.

У вёсцы асноўная ўвага шырокіх мас сялянак павінна быць накіравана на задачы пасоўваньня вёскі да буйнай калектыўнай гаспадаркі, вытворчага каапэрыраваньня і згуртаваньня вакол партыі і саветаў бядняцка-батрацкага і серадняцкага актыву.

Побач з гэтым, як у горадзе, так і ў вёсцы, стаяць задачы ўцягненьня найбольш падрыхтаваных работніц, батрачак і бяднячак у партыю, павышэньня культурна-палітычнага ўзроўню працоўных жаночых мас, задачы пазбаўленьня ад дадатковай хатняй працы, ад догляду за дзецьмі.

Не малое месца ў кампаніі да Міжнароднага Жаночага Дню займае задача вылучэньня работніц на больш адказную работу ў саветы, прафсаюзы, каапэрацыю, савецкія і адміністрацыйна-гаспадарчыя ўстановы.



т. Арцюхіна—заг. жанаддзелу ЦК УсеКП(б).

За гады рэвалюцыі работніцы і сялянкі нашае краіны маюць значны посьпех як у галіне ўцягненьня ў грамадзкую работу, так і ў галіне паляпшэньня свайго эканамічнага становішча. Нідзе, ні ў воднай краіне, апрача СССР, да гэтага часу няма роўнай аплаты за роўную працу.

Як-бы добра ні працавала работніца—праца аплачваецца ніжэй за мужчынскую. Ні ў воднай буржуазнай краіне не праведзена законадаўства, на падставе якога было-б магчыма работніцы ў больш ці менш людзкіх умовах радзіць сваіх дзяцей. Нідзе работніца не атрымоўвае неабходнага водпуску на час радзін. Для дзяцей работніц няма ясель, няма дзіцячых садоў. Мацярынства для работніц капіталістычных краін зьяўляецца вельмі цяжкім.

У нас зусім іншае. Мы часамі не заўважаем нашых дасягненьняў. Нам мала таго, што маем; нам яшчэ шмат чаго трэба дарабіць.

Але мы, працоўныя жанчыны Савецкае краіны, добра ведаем, што чым больш будзе наладжвацца наша гаспадарка, разьвівацца наша тэхніка, расьці наша багацьце, тым больш мы зможам будаваць устаноў, якія вызваляюць пралетарак ад дадат-

ковае хатняе працы, ад клапот па выхаваньню дзяцей. У гэтай рабоце вялізарнае значэньне мае актыўны ўдзел, самадзейнасьць саміх жаночых працоўных мас. Яны павінны рупіцца аб тым, каб лепш працавалі ўжо існуючыя ўстановы па паляпшэньню быта і аб тым, каб будаваць новыя, ня толькі за кошт дзяржавы, але і за кошт грамадзкіх аргэнізацый (саюзаў, коопэрацыі, КСУ), за лік збораў на гэту мэту сярод самога насельніцтва.

Вялікія кадры пролетарак уцягнуты намі ў грамадзкую працу. Мы маем 6.376 работніц і служачых у адных нізавых прафсаюзных органах, 2.315 членаў савету.

Але шмат яшчэ трэба зрабіць дзеля таго, каб працоўныя жанчыны прынялі роўнацэнны ўдзел ва ўсёй рабоце па сацыялістычнаму будаўніцтву нашае краіны. Процант удзелу працоўных жанчын у рабоце прафсаюзных органаў, у рабоце саветаў і ў рабоце коопэрацыі ўсё яшчэ невялікі. Асабліва нязначны гэты ўдзел у кіраўнічых органах.

Значнай перашкодай на шляху прасоўваньня і вылучэньня працоўных жанчын на кіраўнічую работу зьяўляецца нядосыцны культурны ўзровень шырокіх мас працоўных жанчын. Нават сярод работніц і сялянак, што прымаюць актыўны ўдзел у рабоце, яшчэ ёсьць значны процант няпісьменных і малапісьменных. Вялікі процант няпісьменных мы маем і сярод дэлегатак, якія зьяўляюцца асноўным пластом, з якога вырбуецца і будзе вербавацца актыў грамадзкіх працаўніц, не гаворачы ўжо пра шырокія масы працоўных жанчын, сярод якіх няпісьменнасьць яшчэ вельмі вялікая. На кожную пісьменную сялянку прыходзіцца 2—3 няпісьменныя і малапісьменныя, якія ня ўмеюць чытаць, пісаць.

У міжнародны жаночы комуністычны дзень асаблівую ўвагу павінна заняць задача ліквідацыі няпісьменнасьці сярод шырокіх мас працоўных жанчын. Лёзунгам *дню павінна быць: „Ніводнай няпісьменнай грамадзкай працаўніцы", „Ніводнай няпісьменнай дэлегаткі, грамадзкай працаўніцы—члена савету, коопэрацыі, КСУ".* Дэлегаткі павінны ў першую чаргу ліквідаваць няпісьменнасьць сярод сваіх шэрагаў. Жаночы актыў павінен растлумачыць шырокім масам працоўных жанчын значэньне ліквідацыі няпісьменнасьці сярод іх і даць прыклад уцягненьня іх у гэтую работу.

У міжнародны жаночы дзень шырокія масы працоўных жанчын павінны ўзмацніць свой удзел у абароне краіны. Працоўныя жанчыны паказалі, што яны разам з усім пралетарыятам рыхтуюцца да чарговай абароны нашай краіны. У радох Асо-Авіахіму, у гуртках першай дапамогі „Чырвонага крыжу" ўцягнуты тысячы пралетарак БССР. Мы маем 25 проц. жанчын у шэрагах Асо-Авіахіма. У гуртках першай дапамогі Чырвонага крыжу асноўны склад—працоўныя жанчыны. Але яшчэ ня ўсё і тут зроблена.

Трэба палепшыць работу тых, хто ўжо ўцягнут у шэрагі абаронцаў нашае краіны, палепшыць якасьць іх падрыхтоўкі. Павялічыць лік працоўных жанчын, ахопленых гэтай працай. У Міжнародны жаночы дзень павялічым увагу задачам абароны!

У міжнародны жаночы дзень работніцы і сялянкі, усе працоўныя жанчыны перагукаюцца з мільёнамі працоўных жаночых мас, пакутуючых у ланцугах капіталу.

У дзень 8-га сакавіка работніцы і сялянкі павінны яшчэ больш узмацніць сваю дапамогу зарубежным братом і сёстрам, яшчэ больш узмацніць шэрагі МОПР'у.

У міжнародны жаночы дзень работніцы, батрачкі, бяднячкі-сялянкі павінны памятаць аб тым, што толькі пад кіраўніцтвам загартаванай у бойках, стойкай, вытраманай ленінскай комуністычнай партыі прышлі працоўныя да перамогі, пачалі будаваць новае жыцьцё, новую грамаду, дзе праца жанчыны становіцца раўнапраўнай і роўнацэннай.

Лепшыя работніцы, батрачкі і бяднячкі-сялянкі павінны ўліцца ў шэрагі партыі, уся маса працоўных жанчын павінна згуртавацца жалезнай сьцяной вакол яе.

С. Крэмер.

Работніцы і сялянкі, у Міжнародны Жаночы Камуністычны Дзень мацней згуртуйцеся вакол Камуністычнай партыі!

Марк Гольдштейн.

ПРИВЕТ РАБОТНИЦАМ И КРЕСТЬЯНКАМ.

Друзьям по крови,
Друзьям по классу,
Как дар весенний,
Я шлю привет.—
Цветут знамена,
Пылают краски,
Им нет конца—
Предела нет.
Наш путь велик,
Но четки вехи.
Стальные рельсы
Ведут туда,
Где жизнь встает.
В каскадах смена.
В созвучьи песен
И труда.—

Я счастлив тем,
Что наши сестры
Добыли кровью
Праздник свой.—
Что только нам
Маячат версты
Победы
Мировой—
В стране моей—
Большой и юной—
Язык понятный
Мне и вам.
Язык—
Строителей Коммуны,
Язык—
Рабочих и крестьян.

Я слышу в поле
Лязг чугунный,
Я вижу в избах
Электросвет.—
Растут и ширятся
„КОММУНЫ",
Мы стройке этой
Шлем привет.
Растут заводы—
Мы вместе с ними,
Нам дорог
Каждый миг и час.
Привет тебе—
Непобедимый
В социализм
Ведущий класс.

Пройдут года—
Стальные крылья
Расправит
Красная страна.—
Мы строим жизнь,
Мы жизнь открыли
И жизнь по праву
Нам дана.
Наш лозунг—
Труд и сила—масса
Вы наша гордость,
Краса и цвет.—
Друзьям по крови,
Друзьям по классу,
Восьмого Марта
Я шлю привет.—

Лед сломан во всех концах мира. Освобождение народов от ига империализма, освобождение рабочих и работниц от ига капитала идет неудержимо вперед.

Это дело повели вперед десятки и сотни миллионов рабочих и работниц, крестьян и крестьянок.

И потому это дело свободы труда от ига капитала победит во всем мире.

В. И. ЛЕНИН.

ПРИВЕТСТВИЯ ЗАРУБЕЖНЫХ РАБОТНИЦ.

Только революционный пролетариат способен освободить женщину.

Дорогие сестры!

Работницы—женщины г. Габлонза (Чехо-Словакия) шлют Вам к Международному Женскому Дню свой наилучший привет.

Мы в своей стране также празднуем этот день, но у нас он имеет другой характер. Работницы Чехо-Словакии страдают от невыносимо высоких цен на продукты, безработицы и от того, что женская сила у нас теперь очень мало оплачивается. Многие женщины не зарабатывают теперь более 30—50 чехо-словацких крон в неделю. На Ваши деньги это—два-три рубля цены на все продукты потребления растут. Наши дети питаются очень плохо, грудные дети умирают от детского туберкулеза, который является частым гостем рабочей семьи.

Пусть международный женский день разбудит еще несознательных женщин и вовлечет их в ряды великой армии революционного пролетариата, который один только способен освободить женщину.

Мы обещаем Вам, что мы сделаем все, что только возможно сделать нашими силами для того, чтобы последовать Вашему примеру. В этом смысле мы жмем Ваши руки дорогие сестры из Советского Союза и вместе с Вами восклицаем:

Да здравствует международный день работниц!

Да здравствует мировая революция!

Грета Екель, Мэта Ежш, Нильда Зайдель, Каролина Вебер, Вероника Конвалинка, Берта Ляўбер, Эми Бауэр, Варвара Колду, М. Яурэк.

8 марта у нас заграницей—это смотр наших сил.

... От работниц Гётеборга передайте наш пламенный братский привет освобожденной работнице и крестьянке Белоруссии в день Международного Женского праздника.

Ваш праздник—это под'итоживание вашей работы, ваших достижений.

У нас—это смотр наших сил. В этот день коммунистическая партия проводит у нас смотр своих революционных рядов среди женщин. Правда, они еще редки, в них десятки, сотни, но это уже залог того, что скоро будут тысячи.

Мы обещаем Вам неуклонно итти по пути Ленина к Мировому Октябрю.

День 8 марта—день международной переклички революционных женщин всех стран.

Пусть крепнет и расширяется солидарность между работницами Швеции и Белоруссии.

От моего имени и от имени всех работниц Гётеборга—наш братский привет.

Эмма Адамсон.

Гётеборг
Швеция

Зав. Женотделом Гётеборгской Организации ШКП.

т. С. Кремер беседует с представителями сельсоветов, членами ЦИК БССР

ПРАЦЭС 133.

За што іх будуць судзіць.

7-га лютага ў Беластоку пачаўся разгляд справы 133 асоб, абвінавачаных у прыналежнасьці да камуністычнае партыі Заходняй Беларусі. Акт абвінавачаньня абыймае 300 старонак. Падсудныя абвінавачваюцца ў організацыі ЦК кампартыі Заходняй Беларусі, Беластоцкага акр. кам. КПЗБ, раённых і падраённых камітэтаў і некалькіх ячэек. З боку абвінавачваньня на дазнаньне выкліканa 186 сьведак, між імі знаходзіцца галоўны сьведка—провокатар гэтага процэсу Міхась Гурын, працаўнік паўлюкевічаўскага „Беларускага дня". Двое з абвінавачаных—Якуб Чэрнік і Станіслаў Мэртэнс—3 студзеня г. г. абменены з СССР на польскіх шпіёнаў.

Фашысцкі ўрад Пілсудзкага хоча разграміць рэволюцыйны рух у Зах. Беларусі.

(З адозвы ЦК МОПР'у БССР).

Фашысцкі ўрад Пілсудзкага, пры падтрыманьні польскіх меншавікоў-пэпээсаўцаў, у зьвярынай злосьці і нянавісьці да нацыянальна-рэвалюцыйнага руху і Савецкага Саюзу, прабуе дабрацца да мозгу руху—разграміць камуністычную партыю.

Польскі фашызм фізычным зьнішчэньнем барацьбітоў, катаргаю і ссылкаю прадстаўнікоў працоўных Заходняй Беларусі спадзяецца справіцца з вялікім вызваленчым рухам працоўных мас і разьвязаць сабе рукі для будучай вайны.

Польскі фашызм і яго гаспадары—ангельскія імпэрыялістыя, адчуваючы гістарычную няўхільнасьць сваёй пагібелі, рыхтуюць новую вайну, у струменях крыві якой хочуць пахаваць вялікую мэту працоўных мас—пабудаваньне новага сацыялістычнага грамадзтва.

Ідэя стварэньня адзінай свабоднай Савецкай Беларусі, цесна зьвязаная адзіным саюзам працоўных усіх нацый і народаў, глыбока жыве ў сэрцах усіх працоўных Заходняй Беларусі і Польшчы.

Ні тэрор, ні рэпрэсіі ня спыняць вялікага руху працоўных мас да сацыялізму.

Працоўныя свабоднай Савецкай Беларусі! Вы ня мала пралілі крыві ў барацьбе з польскай буржуазіяй і памешчыкамі. Кроў вашых братоў у Заходняй Беларусі льлецца і зараз. З іх радоў польскі фашызм вырывае лепшых сыноў.

Працэс 133-х ёсьць пачатак абдуманага пляну польскага фашызму, дзікай расправы з беларускім народам і яго вызваленчымі імкненьнямі. За ім адбудзецца рад працэсаў над Рабоча-Сялянскай Грамадой і яе дэпутатамі. На працэсы Беларускай Грамады прыцягваецца 490 абвінавачаных і каля тысячы сьведак. Гэтыя масавыя працэсы сьведчаць, што ў Польшчы падрыхтоўваецца суд—расправа над цэлым народам. Рабочыя, сяляне і ўсе працоўныя свабоднай Савецкай Беларусі! Ахвяры з кожным днём павялічваюцца. Наша маральная і матар'яльная дапамога павінна ўзмацніцца. Дамагайцеся вызваленьня прыцягнутых па справе 133-х. Дамагайцеся вызваленьня беларускіх дэпутатаў і 6.000 палітзьняволеных у Польшчы. Узмацняйце міжнародную пралетарскую салідарнасьць.



Селянін **Ваўчок**—зьбіты польскай дыфэнзывай.



Мятла і Валошын—члены Грамады, абодва сяляне.

Пратэстуйце супроць разгрому!

Дапамагайце палітвязьням капіталу.

ЦК МОПР'у БССР.

Работа компартии Польши среди женщин.

Мрачный террор, свирепствующий в фашистской Польше, создает такие условия, что работа коммунистической партии и, в частности, ее работа среди женщин очень тяжела и трудна. Пользуясь очень ограниченной свободой передвижения, находясь в подполье, партия не всегда имеет возможность добраться до широких масс трудящихся женщин и не всегда может достаточно полно охватить, овладеть и руководить движением работниц. С другой стороны, буржуазия, пользуясь недостаточной сознательностью женщин, пытается всеми мерами оторвать женщину-работницу от классовой борьбы, через свои организации, в частности женские. Среди этих буржуазных женских организаций наиболее известны следующие: „Коло полек“ (женский круг), „Товарищество женщин католичек“, „Общество святой Зиты“ (специально для служанок), христианские союзы и т. д.

Для обмана несознательных женских масс эти организации используют всякие средства, вплоть до подкупа. В Верхней Силезии, например, существует общество, так называемой, польской матери; это общество на своих собраниях угощает женщин горячей пищей, спекулируя на голоде и нищете. Там, где ни ксендз, ни подачки буржуазных дам не могут влиять на женщин, в помощь им посылаются польские меньшевики-пепеэсовцы. ППС соз ает отдельные женские организации, цель которых оторвать женские массы от обще-рабочей борьбы. Но женщины-работницы и крестьянки Польши постепенно освобождаются от буржуазного и социал-соглашательского влияния, начинают пробуждаться к борьбе—и влияние коммунистической партии растет среди широких женских масс из года в год.

Важнейшими кампаниями, проведенными компартией в последний год, были следующие: кампания против отсрочки срока открытия ясель при фабриках, кампания 8 марта, 1-го мая, кампания за всеобщую амнистию, ряд предвыборных кампаний. Несмотря на неслыханные полицейские преследования и фашистский террор—кампания 8 марта прошла лучше, чем в предшествовавшие годы и охватила всю Польшу.

В связи с кампанией 8-го марта во всех главнейших центрах Польши тысячи женщин—работниц и крестьянок (общее количество активно участвовавших в кампании равнялось 11.750 женщин, общее число митингов равнялось 63)—выразили свою волю к борьбе. В Варшаве, Лодзи, в Домбровском бассейне, Ченстохове, в Люблине, в Верхней Силезии и во Львове, в Перемышле, в Тарнополе, в Бресте и в Барановичах—везде тысячи женщин демонстрировали под коммунистическими лозунгами.

Компартия ведет постоянную повседневную кампанию защиты насущнейших интересов трудящихся женщин. *Равная плата за равный труд, увеличение пособия безработным, расширение системы выдачи пособий на все категории безработных женщин, борьба против капиталистической рационализации, защита женского труда, охрана материнства и младенчества*—вот лозунги, под которыми партия ведет массы в бой.

Кроме того, партия ведет среди женщин работу по вовлечению наиболее сознательных элементов в партию. Эта работа дает положительные результаты. Теперь женщины составляют 8 проц. членов польской компартии, а совместно с кандидатами 12 проц. Партийные организации пытаются воспитывать специальные кадры женработников, для чего создаются краткосрочные и долгосрочные партийные курсы, для чего издается литература и периодическая женская печать.

Особое место в деятельности партии вообще, и, в частности, среди женщин, занимает постоянная, безустанная активная кампания для организации массового протеста против подготовляемого империалистами, в том числе Польши, нападения на СССР.

Партия ведет кампанию раз'яснения положения рабочих и крестьян, в частности женщин, в Советском Союзе. Интерес к СССР сильно возрос среди трудящихся женщин Польши. Завоевания работниц и крестьянок в СССР кажутся польским пролетаркам „чудом“ и являются путеводной звездой для них, указывающей дорогу польскому пролетариату.

М. Романовская.

З. Бандарына.

8-е сакавіка.

Цэшыцца сэрца жаночае сёньня,
Радасьць, бы зорка, у вачох іскрыцца,
Песьні ўплятаюць пра шчасьце і вольнасьць,—
Сьвята, сусьветнае сьвята, сястрыца!

Закліч заходнім братом—хай імкнуцца,
Час рыхтавацца на бойку, да помсты,
Панства зруйнуем, прыходзе канец ім,
Чуем адтуль мільённы мы голас.

Цешыцца сэрца жаночае сёньня,
Радасьць, бы зорка, у вачох іскрыцца.
Песьні ўплятаюць пра шчасьце і вольнасьць,—
Сьвята, сусьветнае сьвята, сястрыца!

Марыля.

Вясковай кабеце.

Ты знала прыгоншчыну старага пана,
Ты плакала вечна ад рана да рана,
Ты зносіла гвалты і зьдзекі з пакорай,
Ты мела бязьмерна пакуты і гора.

Мінулі нядолі-няволі часіны,—
Ужо над кабетай ня строяцца кпіны,
Ніхто не кране яе нават на волас.
Кабета, ты маеш у вокрузе голас!

Дзяўчына малодая, сталая матка,
На зьездах саветаў і ты дэлегаткай!
Будуй сваё шчасьце адважна і поўна—
Пад сьцягам чырвоным з усімі ты роўна!

▼▼▼▼▼▼▼▼▼▼

НА МАЛАДОЕ

Зьмест папярэдняга: Ахрэм пачаў біць Марыльку за тое, што з Васільком зьвязалася. Між тым і восень халодная надыйшла. Сталі радзей сустракацца. Але вось аднойчы Васілёк робіць Марылыны такую прапанову: кінуць Ахрэма, перайці да яго, Васілька, жыць. Марылька спужалася гэтага—засьмяюць вяскоўцы. Угаварыў Васілёк, згадзілася. Але як сказала Ахрэму, як убачыла яго пакорнасьць тупую—перадумала, дала слова Ахрэму жыць з ім. А Ахрэм не супакоіўся, рэўнасьць супакою не давала. І парашыў ён схадзіць да шаптухі Гаўрыліхі, узяць зельля якога, каб прываражыць Марыльку да сябе, каб забылася на Васілька свайго. Гаўрыліха ня мела вока на Ахрэма, што ня ўзяў дачкі яе, і рашыла адпомсьціць яму. Зельля дала для Марылькі...

VII.

За вёскай, там, дзе пажоўклы бор сьвіціўся новымі блакітнымі прагаламі, было астатняе спатканьне Марылькі з Васільком. На вёсцы, выпадкова спаткаўшыся, шапарнула яму, каб прыходзіў сюды, сказала, што пільна трэба пагутарыць.

Цяпер стаяла на ўзьлесьсі, угарнуўшыся ў невялічкі кажушок, і чакала.

Жаль ціснуў сэрца, быццам сокі з яго, кроў выцэджваў. Ціснуў так цягуча, станоўка. Шкода было сябе, Васілька шкода—любага хлопчыка. Ён такі шчыры, сумленны. Добры такі. Цяжка крыўдзіць яго. Здаецца, усё-б аддала за тое, каб не гаварыць з ім аб гэтым, каб спаткацца так, як раней, каб забыцца на ўсё, нічога ня знаць.

Але ня можа Марылька іначай. Ня здольна яна хаваць што ад любага, усё скажа па праўдзе, адразу скажа. Няхай будзе, што будзе.

Як падходзіў к лесу Васілёк, відаць было, што сьпяшаецца ён. Пэўна, трывога запала ў сэрца, зьдзівіла нечакана назначанае спатканьне.

Убачыў яе, падышоў. Упяўся палахліва-ўстрывожаным поглядам.

— Ну, што, Марылька?

— Васілёк, ня будзе нічога... Я перадумала, ня буду развадзіцца з Ахрэмам.

— Як гэта так?..

— Не магу я, Васілёк, баюся. Соромна... Дый усё роўна—ня будзе нічога...

— Чаго ня будзе?

— Не наладзім мы з табой, Васілёк, жыцьця свайго. Ты яшчэ маладзенькі зусім, дзяцёнак... Дужа патрэбна табе нахабу браць на сябе. Потым каяцца будзеш, ды позна...

Васілёк глядзеў у дол пахмурым, троху загневаным поглядам.

— Ня буду я каяцца. Не дзяцёнак я маленькі, і ведаю, што раблю. І ня тое ты гаворыш, Марылька, не затым ты ня хочаш рабіць гэтага. Пэўна, другая прычына ёсьць у цябе, ды ня хочаш сказаць, хаваеш ад мяне.

— Ды не, Васілёк. Да-душы, нічагутка ад цябе не хаваю, шчырую праўду кажу. Я адно чую, што замест шчасьця—няшчасьце, гароту мы сабе здабудзем. Так, Васілёк, ты й сам добра падумай...

— Ня любіш ты мяне, во што. Каб любіла, не гаварыла-б гэтага. Пэўна, надакучыў, зьнялюбеў...

Вочы Марылькі раптам сьлязой нечаканай бліснулі.

— Соромна табе, Васілёк, так гаварыць. Крыўдзіш мяне дарэмна. Сам ведаеш добра, ці люблю я цябе, ці не...

Васілька таксама шкрабанула за жывое.

— Ну, дык чаго-ж ты, Марылька. Нашто-ж ты мяне крыўдзіш. Думаеш, мне лёгка чуць гэта, думаеш, я—так сабе, жартую; думаеш, у мяне сэрца няма, камень замест яго ў грудзёх...

Яго голас дрыжэў. Шчырае, маладое абурэньне чулася ў ім. Марылька памкнулася да яго, моцна сьціснула за рукі.

— Васілёк! Ты даруй мне, але я не магу іначай. Я ведаю, што раблю, бо я больш за цябе пражыла на сьвеце, больш чаго набачылася: і шчасьце, і гора людзкога.

Часіну маўчалі. Ціха, жалабна шапацелі панурыя дрэвы. Было сьцюдзёна, няпрытульна ў лесе.

Васілёк абапёрся аб дрэва, глядзеў у вадну кропку на жоўцю пасыпаны дол, думаў. Вочы халодныя, застыглыя, стальлю працятыя. Марылька да яго прытулілася, абняла пяшчотна, ласкава.

— Ты ня сумуй, Васілёк. Мы з табой будзем сустракацца, будзем так, як раней.

— Не, так ужо ня будзе. Я не хачу. Ня будзем мы з табой сустракацца. Можа й ніколі ня ўбачымся.

— Чаму так?

— А так!..

— Ты скажы, Васілёк, што ты хочаш зрабіць.

— Ат! Сьвет вялікі, знайду сабе месца. Толькі ня буду тут жыць больш на вёсцы. Паеду ў горад, паступлю на завод. Рукі ёсьць, і нішто сабе, не слабыя—здалею працаваць.

Васілёк цяпер узіраўся ў далеч, у халодны бязьмежны працяг, і сьвяцілася ў яго вачох адчайная бадзёрасьць, адвага, якая гаварыла, што чалавек гэты можа цяпер усё зрабіць, што захоча.

Міжвольна Марылька нейкай павагай працялася да Васілька, чувала ў ім моцнага, дужага мужчыну, які толькі цяпер нарадзіўся з хлапца-падуросты.

Яны больш нічога не гаварылі, стаялі моўчкі нейкі час, апанаваныя кожны сваймі асобнымі думкамі. Потым Васілёк раптам схапянуўся.

— Ну, бывай здарова, Марылька.

Сказаў голасам цьвёрдым, спакойным. Пасяброўску паціснуў руку і хацеў ужо ісьці, але Марылька ня выпусьціла яго рукі. Сударгава прыціснула да грудзей, зазірнула ў халодныя вочы Васілька поглядам, поўным журбы і дакору.

— Васілёк!

Апошні пацалунак—сухі, мімалётны.

Пашоў. Знаёмай любай хадою.

Асталася адна.

Холад вакол. Холад на сэрцы.

Сумна-сумна...

VIII.

Васілёк зьнік. Хадзілі чуткі, што ў горадзе на завод паступіў, нішто сабе жыве. Праз два тыдні і ліст прыслаў хлапцам вясковым. Пісаў, што весела ў горадзе: жыцьцё бушуе, праца кіпіць. Пісаў, што многа працуе, а ў вольны час кніжкі чытае, на сходкі ходзіць—розуму набіраецца.

Марылька, як прачула пра ліст Васількоў, заплакала ўцішку сьлязьмі ціхімі, горкімі. Крыўдна было, што Васілёк забыўся на яе, што жыве ён весела, ня так, як яна, гаротная.

І стала думаць Марылька аб сваім жыцьці. На ружовым, сьветлым фоне мінулага бруднымі плямамі агідна адзначаліся малюнкі сучаснага. Бязуцешная мядзяньне, нялюбы мужык, пастаяннае зьнібеньне нездаволенага, журбуючага сэрца. Зьнікла ўсякая цікавасьць да жыцьця, быццам праходзіць яно воддаль, ня кратае яе.

Нават на здароўе сваё мала зьвяртала ўвагі Марылька. Той боль, што прыкрым клубком у апошні час зьвіўся ў грудзёх, тая слабасьць, што часам блытала, цяжарыла ногі, прымушала ў зьнямозе садзіцца на ложак,—усё гэта мала турбавала Марыльку. Вось толькі часам, як убачыць у люстэрцы свой паніклы, зжаўцелы твар, уздыхне цяжка, задумаецца...

З чаго-б гэта? Вось з таго часу, як паехаў Васілёк, і пачалося. Сохне нешта Марылька, як галіна сьцятая з дрэва, слабее, усё болей і болей хворасьць у сабе адчувае. Хворасьць — нішто, але вось шкода Марыльцы прыгаства свайго жаночага. Прыкра, што цела такое друзлае, брыдкае, што грудзі шмоткай нялюбай паніклі, што чырвань на твары зьмянілася жоўцю сінявай. З чаго-б гэта?

Ніяк не згадае Марылька. Нічога ня ведае маладзіца, нічога не прыкмячае. Ня бачыць, як часам мужык узіраецца ў яе нецярплівым поглядам, быццам напружана чакае чагось ад яе.

Але прышоў час і Марылька заспакоілася. Гэта было тады, як пачула яна ў сярэдзіне нейкае дзіўнае і прыемнае трапятаньне, быццам узварухнулася нешта пад сэрцам. Тады Марылькін твар закрасаваў усьмешкай шчасьлівай і ў думках пранялося маланкай.

— На маладое...

Пасьля гэтага яна ўжо не задумвалася аб сваёй хваробе. Усё стала зразумела. Дзіўна было, як яна дасюль не дазналася. Гэта-ж зусім звычайная рэч, гэта-ж заўсёды ў гэткім выпадку хварэюць.

— На маладое...

Нават павесялела Марылька. Часьцей Васілька ўспамінала і песьціла думку, што будзе ў яе Васілёк—другі, але такі самы дарагі, любы. Таксама будзе кахаць яго Марылька. А мо' яшчэ болей, бо ён будзе за двох: і за таго, што паехаў, што недзе далёка.

Пасьля пакрову захацелася Марыльцы да маткі старой зьезьдзіць, даведацца. Так пацягнула, што проста жыцьця ня стала—усё рупіць. Ноччу ня сьпіць, уваччу родныя абразы, матуля старэнькая ўспамінаецца, глядзіць чагось сумнымі, жаласнымі вачмі. І ў сьне таксама хату родную бачыць...

Сказала Марылька мужыку пра тое, што хоча зьезьдзіць да маткі, дык той рукамі замахаў: ня хоча, дый годзе. Але Марыльку трудна было адгаварыць ад задуманага. Сказала Ахрэму, што калі не завязе, дык пяшком пойдзе, не паглядзіць на хваробу, на слабасьць сваю. Тады згадзіўся Ахрэм. Паехалі.

Да вёскі, адкуль брана Марылька, было вёрст дваццаць. Ехалі лесам. Шумацеў лес пудлівым жалобным шолахам, дрэвы голымі драцянымі галінамі шкрабалі неба.

Неба далёкае, халоднае і нейкае зеленаватае. Быццам не паветра, а лёд расплыўся ўгары празрыстай пялёнкай...

Добра адчувалася Марыльцы. Ядранае васеньняе паветра глыбока ўлівалася ў грудзі сьвежай, халоднай хваляй, пранікала, здаецца, у самую глыб, моцным парываньнем жыцьцёвую сілу ўздымала.

Затрапяталася сэрца салодка, вольна. Твар заірдзеўся даўно страчанай чырваньню. Здалося Марыльцы жыцьцё зноў павабным, прыгожым, як калісьці даўней. Не яе, Марылькіна жыцьцё, а жыцьцё наогул, тое, што ўсё абымае, злучае, усё напаў-

няе духам непакойным, бурлівым, штурхае ўсё наперад, да лепшага, да прыгажэйшага. Мо‘ гэта жыццё і ёй яшчэ дасць колькі сонечных, ясных дзянькоў. Мо‘ зусім і ня варта яшчэ пакладацца на брудна-цягучую, тухлую плынь марнага мядзяньня.

Нібы ў пацьверджаньне гэтых думак пачула Марылька знаёмае варуханьне пад сэрцам. Усьміхнулася ласкава дзіцячай усьмешкай, заплюшчыла вочы, утулілася, схавалася з тварам у вялізную дзядоўскую хутру.

Галава чагось закруцілася—пэўна, ад гэтага вострага, ап‘яняючага паветра. Але нішто—гэта мінецца.

Ужо пайшлі знаёмыя, родныя мясьціны. Ужо ўспамінкі пачалі вострымі, нечаканымі іголкамі працінаць узрушанае, настарожанае сэрца.

Неяк так: глядзіць, напрыклад, на якую лагчынку, і—нібы-та што. А потым ураз маланкай мігне які абразок з мінулага, зьвязаны з гэтай лагчынкай, і раптам кальне неяк у сэрца. І ажыве лагчынка, зусім іншай зробіцца—не пазнаць. Кожны кусьцік, кожнае дрэўка—усё сваё, знаёмае. Здаецца Марыльцы, што ўсё гэта жыве, радуецца, вітае яе...

А Ахрэм сядзеў моўчкі ўсю дарогу. Думаў аб нечым. Марыльцы ён чужы быў, далёкі, быццам ня мужык гэта яе, а нейкі падарожны, да якога яна села пад‘ехаць.

У дварэ першая спаткала Марыльку старая матка. Заплакала, зарумзала старая, як убачыла дачку. І з радасьці, і з таго, што так зьмянілася яе дачка, так дрэнна выглядае.

— Чаго-ж гэта ты так схуднела, га? Ці не хварэла ты часам? І вестачкі ня прыслала ніякай...

Марылька не адказвала нічога: цяжка было гаварыць, нешта грудзі сьціскала.

Гоман, тлум, сумятня... Заўсёды ўжо гэтак бывае, як зьявяцца нечаканыя госьці. Гаварыў больш Ахрэм, а Марылька толькі моўчкі ўсьміхалася ціхай усьмешкай. З дарогі слабасьць адчувалася. Хацелася легчы адпачыць, але неяк нялоўка было.

Матка падышла да яе, ціха спыталася:

— Дык чаго-ж ты, дачушка, гэтак зьнядужала? Што гэта табе прытрапілася?

Марылька зачырванела, шапарнула матцы на вуха:

— На маладое гэта, матулька,—цяжарная я...

— А... Дык дужа-ж нешта табе гэта пашкодзіла... Пэўна на хлопчыка... Так, так.

І заспакоілася старая, больш ня пытала Марыльку.

Сышліся суседкі. Загудзелі ўвушшу аднамерна-траскучай гутаркай. У галаве ў Марылькі званы няўпынна зьвінелі, зыбкі туман расьцілаўся.

Пілі гарбату. Ахрэм чамусь сам наліваў ёй,—дзіўна... І гарбата нясмачная—пахне зельлем нейкім.

Гутарка, тлум, духата... Ня вытрымала Марылька. Устала, дацягнулася да ложка, лягла.

Невядома: ці заснула, ці мо‘ самлела, зьняможаная.

IX.

На другі дзень Марылька ня ўстала з ложка. Усё цела быццам сьвінцом налілося, было не сваё, а чужое нейкае.

І ў галаве—таксама сьвінец, давіць на чэрап балюча, прыкра. Трудна варочаць цяжкім сьвінцом, каб выціснуць думку якую.

Але горш за ўсё—гэта грудзі. Нешта сядзіць там клубком важкім, цьвёрдым, бы камень які. Хочацца выхаркнуць гэты клубок, каб лёгка было ў грудзёх хворых, ды нельга. Як кашлянеш, боль у грудзёх—тупая нейкая, але моцная—дух заціпае.

У хаце затурбаваліся ўсе, засумяціліся. Матка кожную часінку падыходзіла, заглядала дапытліва ў вочы. Не гаварыла нічога, толькі глядзела. Марылька бачыла ў яе цьмяных сьлязьлівых вачох адбітак свайго болю. Ахапляла шчырая ўдзячнасьць, каханьне да старое маткі.

Ахрэм таксама нічога не гаварыў, нават не падыходзіў. І за гэта дзякавала яму ў думках Марылька. Яна нават баялася, каб часам не падышоў да яе, не пачаў гутарыць. Яна і сама ня ведала, чаму так прыкра бачыць яго, чаму цяжка адчуваць яго прысутнасьць.

Чорная бруднай плямай здавалася Марыльцы фігура мужыка. Гэтая пляма гняла яе, непакоіла і міжвольна цягнула да сябе, як часам прыцягвае наш погляд іншая нялюбая і прыкрая рэч. Здаецца не глядзеў-бы на яе, уцёк куды-небудзь, а тымчасам глядзіш, адарвацца ня можаш.

.. Стаялі моўчкі... (да стар. 7)

Глядзела Марылька на мужыка, проці волі ўпівалася вачамі ў яго няпрыгожыя, рэзка, агідна скрыўленыя р ы с ы. Яны выяўлялі моцнае затоеная абурэньне. Не згадаць: ці-то жаль сьвяціўся ў яго сьлізкіх вачох, ці то спалох нейкі, замятня стрымленая.

Часамі чагось уздрыгваў раптам Ахрэм, быццам нейкая думка працінала яго, абдавала нэрвова-турбуючай хваляй.

Прышоў у двор браценьнік Марылькі—Міхась, камсамолец. Быў недзе на вечары, там начаваў, і ня ведаў яшчэ, што сястра прыехала.

Міхась—хлапец сакавіты, прыгожы, у Марыльку ўрадзіўся. Унёс у хату з сабой маладую рухавасьць. Да Марылькі зьвярнуўся.

— Эге! Што-ж ты гэта, галубачка, хварэць уздумала. Нядобра гэта, не пакамсамольску. Так часам і памерці можна—куды-ж гэта варта...

Марылька ветла ўсьміхнулася. Міхась ёй напомніў яе Васілька. Той таксама гэткі рухавы, вясёлы.

— А за дохтарам паехаў хто?—пытаўся Міхась.—Не? Вот табе й маеш. Ці ня з глузду вы ўсе пазьехалі. Чаго-ж чакаеце? Контр-рэволюцыянэры вы гэткія. Татка! Пашоў запрагай сваю шаўлюжку, я зараз паеду сам у горад.

Ахрэм раптам чагось страпянуўся.

— Ат! Выдумае—дохтара. Дохтар пасобіць якраз. За блізкі сьвет ехаць, што гэта жартачкі. Мы зараз у двор паедзем, там баба Гаўрыліха паглядзіць, ня горш якога дохтара лечыць.

Міхась зірнуў на яго скосу, сказаў жартоўна-пагардлівым тонам:

— Цемра. Маўчы. Сам у бабы лячыся, калі да таго сьвету маеш сымпатыю.

А Ахрэм сапраўды ўзлаваўся.

— Да ты ўжо дужа разумны. Жосткі які. Ня ты хварэеш, дык няма чаго і гвалт уздымаць.

Міхась уважна зірнуў на яго.

— Але-ж ты таксама, здаецца, здаровы. Марылька, ехаць за дохтарам?

— Як сабе хочаш. Толькі ў двор не паеду я. Ні за што не паеду. Я тут папраўлюся... Або памру...

— Ну вось бачыш. Татка, ідзі запрагай.

Як ужо Міхась наладзіў ехаць, Марыльку раптам працяла нечаканая палкая думка. Непакойна заварушылася на ложку, змагалася сама з сабой: ці сказаць Міхасю, ці лепш устрымацца, каб ня вышла чаго нядобрага.

Але ўрэшце ня вытрымала, паклікала да сябе хлапца. Сказала яму ціха-ціха, каб ніхто не пачуў, асабліва Ахрэм:

— Міхаська, ці ведаеш ты Васіля, нашага хлопца?

— Гэта такі белы, валасы сукрыстыя?

— Во-во!

— Чаму ня ведаю. Ну?

— Ён там, у горадзе, на заводзе недзе працуе, калі будзе час, адшукай яго там.

— І што яму сказаць?

— Скажы... ну, скажы, што я хворая, што...

— Добра, разумею. Усё раскажу як належыць.

Ён падмігнуў хітравата.

— Так... іш ты, справа якая. Добра, абавязкова знайду. Скажу, што ляжыш ты, сумуеш, успамінаеш яго.

Марылька ўсьміхнулася саромліва.

— Ну, добра, едзь ужо...

Міхась паехаў. Марылька праводзіла яго ў думках. Рахавала:

— Да гораду дваццаць вёрст; пэўна, будзе ехаць гадзіны са тры... Там будзе дзьве або тры гадзіны... Назад тры. Якраз к вечару вярнецца.

І потым увесь дзень Марылька жыла вострым чаканьнем. Лічыла гадзіны, і дзівілася, чаму так марудна яны паўзуць... Назад тры. Ня дзень, а год цэлы.

Думкамі Марылька пераляцела ў горад, туды, дзе жыцьцё бушуе, дзе весела, прыгожа. Там іншыя людзі, там разумныя ўсе. І яе Васілёк, пэўна таксама разумны стаў, вучоны: усё-ж кніжкі чытае...

(Канец будзе).

▼▼▼▼▼▼▼▼▼▼

За новую вёску, за культурнае жыцьцё.

(Наконт закону аб самаабкладаньні).

Урадам СССР і БССР выдан закон, на падставе якога сялянства мае правесьці самаабкладаньне на культурнае ўпарадкаваньне вёскі. Гэты закон мае вялікае значэньне дзеля сялян.

Кожная сялянка ведае, як моцна ўзрасьлі ў вёсцы патрабаваньні і на школу, і на бальніцу, і на лікпункт і г. д. Кожная сялянка ведае, якая патрэба ў вёсцы на акушэрку і на ясьлі. Але, каб пабудаваць столькі бальніц, колькі трэба, паправіць масты, збудаваць лазьню, даць вёсцы больш ясьляў, пляцовак,—на ўсё гэта патрэбны сродкі.

Савецкая ўлада траціць вялікія сродкі на задаваленьне патрэбаў вёскі: з кожнай сотні сельгасп. падатку каля 70 рублёў траціцца на вёску. Але на ўсё, што трэба для вёскі, дзяржаўных сродкаў не хапае, а больш дзяржава даць ня можа.

Вось чаму дзяржава і выдала закон аб самаабкладаньні. Па гэтаму закону селянін мае магчымасьць сваімі сродкамі ўдзельнічаць у будаўніцтве новае вёскі.

Што-ж трэба ведаць аб гэтым законе.

Папершае — кожная сялянка павінна ведаць, што самаабкладаньне можа праводзіцца на культурныя патрэбы; напрыклад, пабудова школы, бальніцы, хаты-чытальні, праўка дарогі, мастоў і г. д.

Сродкі ад самаабкладаньня ні ў якім выпадку ня могуць траціцца на аплату пэнсіі працоўнікам сельсавету, раёну і г. д.

Падругое — трэба ведаць, што будзе плаціць больш той, хто багачэй, хто плаціць больш падатку.

Патрэцяе—пастанова аб самаабкладаньні выносіцца самімі сельскімі сходамі і зацьвярджаецца большасьцю галасоў; стала-быць, гэта справа зусім добраахвотная.

Якія-ж задачы ўскладаюцца на кожную батрачку, бяднячку, сераднячку.

Цяпер ва ўсіх сельсаветах абгарваецца закон аб парадку самаабкладаньня. Кожная батрачка, бяднячка, сераднячка павінна прыняць актыўны ўдзел ў абгаварэньні гэтага закону.

Усе, як адна, павінны прысутнічаць на сходах. Яны сваімі галасамі павінны дамагацца таго, каб сходы вынесьлі пастанову аб самаабкладаньні. Яны павінны сказаць сваё слова—на што трэба патраціць сродкі: школу, хату-чытальню, папраўку моста і г. д. Дэлегатка, грамадзкая працаўніца і ўсе працоўныя сялянкі павінны дамагацца на сходах таго, каб частку сродкаў ад самаабкладаньня выкарыстаць на патрэбы сялянкі-маці: на ясьлі, пляцоўкі, бо хутка пачнецца падрыхтоўчая кампанія да адчыненьня гэтых дзіцячых устаноў.

Вялікая задача ўскладаецца на дэлегацкія сходы і грамадзкіх працаўніц. Закон аб самаабкладаньні павінен быць абгаворан на дэлегацкіх сходах. Яны павінны сказаць сваю думку аб тым, што самаабкладаньне патрэбна. Дэлегатка павінна вытлумачыць сялянкам і сялянам значэньне для вёскі новага закону.

Дэлегаткі і ўсе батрачкі, бяднячкі і сераднячкі павінны сачыць за тым, каб раскладка абкладаньня была зроблена правільна, каб плаціў сапраўды больш той, хто мае.

Пры дружнай актыўнасьці самога сялянства вёска шпарка пойдзе па шляху абнаўленьня да лепшага культурнага жыцьця.

▼▼▼▼▼▼▼▼▼▼

ДЕСЯТЬ ЛЕТ КРАСНОЙ АРМИИ.

Постановлением Совета Народных Комиссаров от 23 февраля 1918 года была организована Красная армия.

С того времени прошло 10 лет. Путь, пройденный Красной армией в годы гражданской войны, в момент, когда Советскому Союзу угрожала опасность со всех сторон, есть путь борьбы за советскую власть, путь борьбы за освобождение рабочего класса и крестьянства из-под ига капитала и помещиков. И в этой героической борьбе Красная армия на всех фронтах побеждала.

Тов. **Ворошилов**—Наркомвоенмор и предрезвоенсовета СССР.

Как это случилось, что рабочие и крестьяне, никогда не учившиеся управлять, сумели построить крепкую Красную армию. Как же это случилось, что мы победили?

Вопрос этот должен знать каждый трудящийся. Мы это должны знать для того, чтобы побеждать в будущих, подготовляемых буржуазией Советскому Союзу, новых боях.

Тов. Ленин указал на следующие причины, которыми об'ясняется наша победа.

Прежде всего наша победа об'ясняется тем, что во главе стояла коммунистическая партия. Стальная Ленинская партия была организатором и вождем революции. Партия создавала Красную армию. Партия воодушевляла ее ряды. Партия вела в бой Красную армию, будучи всегда в первых ее рядах.

Мы победили потому, что под руководством партии создан был боевой союз рабочих и крестьян—Красной армии.

Ценой неслыханных жертв, неслыханного, невиданного в истории героизма рабочего класса и трудового крестьянства, мы в 1921 году добились передышки. Наступил период мирного строительства, период восстановления нашего хозяйства.

Политика Советского Союза, была, есть и останется политикой мира. Мы—за мирный труд, за социалистическое строительство нашей страны. Но капиталисты, вот уже на протяжении ряда лет стремятся к тому, чтобы помешать нашему строительству, кладут все усилия к тому, чтобы уничтожить единственную в мире страну диктатуры пролетариата. Бешеные военные приготовления буржуазии, в особенности за последний год, говорят за то, что буржуазия готовится вновь навязать нашему Союзу войну.

Исходя из этого, перед нами стоит задача подготовить нашу страну к обороне, привлечь к этому важному делу всех трудящихся Союза.

15-й с'езд партии обратил серьезное внимание на укрепление обороноспособности нашей страны. Особое внимание с'езд обратил на приспособление нашей промышленности к задачам обороны страны, что и было учтено в пятилетнем плане хозяйственного развития нашей страны.

Но ведь участие промышленности еще недостаточно, необходимо широкое участие всех трудящихся в практической подготовке к обороне, необходимо добиться плановости в работе ячеек Осоавиахима, кружков военных знаний, санитарных и т. д. Необходимо добиться широкого участия всех трудящихся женщин в деле обороны страны.

Мы в этом отношении имеем громадные достижения. Их необходимо закрепить.

В 10-тилетие Красной армии каждая работница и крестьянка, каждая труженица должна еще больше окружить Красную армию любовью и вниманием.

Рабочие и работницы должны еще больше укрепить связь с содружественными частями Красной армии.

Широкое участие трудящихся женщин в деле обороны, социалистического строительства, под руководством партии Ленина, поможет укреплению мощи Красной армии, обеспечит ее резерв в победе над капиталом.

Тов. Богат-Бочкова, дочь рабочего механ. завода. В 1927 году окончила Военную Академию. Сейчас работает в женотделе ЦК ВКП(б)

М. Шмидт.

Общество Красного Креста расширяет и углубляет свою работу.

(*Городокский район. Вит. округа*).

В июне месяце 1927 года была выбрана инициативная группа по организации общества „Красного Креста“ в нашем районе. В сентябре месяце был избран Райкомитет, который и начал свою работу с докладов о значении общества „Красного Креста“, его задач и цели.

Велась вербовка членов и когда было собрано сто человек были открыты курсы первой помощи, которые и окончило 45 человек. Выпуск окончивших был приурочен к торжественному заседанию, посвященному десятилетию Октябрьской революции.

В настоящее время кончает свою работу второй кружок первой помощи, в который записалось 54 человека, но посещает только 35. Такой упадок посещения об'ясняется тем, что врач С., который взялся преподавать практические занятия, относится очень небрежно к своим обязанностям: то не является в назначенное время, то уезжает, то устает. А ведь работа оплачивается и хочется, чтобы курсанты получили знания.

За все время работы Райкомитета было поставлено 7 докладов в городе и 4 на районе по делегатским пунктам.

Была проведена экскурсия для осмотра вагона здравоохранения.

Сейчас имется 238 членов общества.

Некоторые мелкие препятствия иногда тормозят работу. Так, например, были Окркурсы красных сестер; от наших 150 человек не приняли ни одной и это возмутило крестьянок. Или, например, когда нужен Нардом для вечера приходится долго упрашивать Заведывающего Госкино (при условии оплаты фактических расходов). Приходится напрягать все усилия для преодоления препятствий и вести дело вперед.

Недавно, совместно с любителями сцены, поставили спектакль, выручили чистого сбора 75 р.

А. С.

Воспоминания о работе одного санитарного отряда.

В гражданскую войну я работала в Красной армии десятой стрелковой дивизии, в перевязочном эпидемическом отряде. Такие отряды обслуживались почти исключительно женским персоналом, мужчин было мало.

Помнится мне, как на Северо-Западном фронте перед наступлением на Псков работницы нашего отряда по несколько суток без перерыва энергично оказывали помощь раненым и сыпно-тифозным больным.

Помнится мне также, как мы были переброшены в город Минск и не успели развернуться как следует, как получили от части приказ немедленно эвакуироваться.

В Речице только развернули нашу помощь, в которой так нуждались борцы, как также должны были эвакуироваться в Гомель, где на время остановился наш отряд.

Приходилось нам и с винтовкой в руках стоять на посту в карауле и охранять склады.

В настоящий момент невольно вспоминается трудное время, когда советская страна была окружена со всех сторон белогвардейцами. Как трудно было бороться с этой черной хмарой и все-таки наша доблестная Красная армия при помощи рабочих и крестьян, под руководством коммунистической партии, справилась с врагами.

Работница **Потехина.**

Городокский санитарный кружок.

УсеКП(б)—ПРАВАДЫР І БУДАЎНІК ЧЫРВОНАЕ АРМІІ. Шчыльней зьяднаем баявыя шэрагі вакол УсеКП(б) і яе Ленінскага ЦК.

РАБОТНІЦЫ І СЯЛЯНКІ! Дапамагайце ўзмацненьню Чырвонай арміі. Уступайце ў ваенныя і санітарныя гурткі. РЫХТУЙЦЕСЯ ДА АБАРОНЫ САВЕЦКАГА САЮЗУ.

РАБОТНИЦА В ПР



т. Пекарь—слесарь (Минск, зав. „Энергия“).

Работница—за квалификацию!

(Минск, Обувная фабрика).

На нашей фабрике за последнее время часть работниц (процентов 6) выдвинуто на квалифицированную работу. Так, например, бывшая работница-уборщица, сейчас работает на заготовочной машине, бывшая пуговщица также. Выдвинуты работницы и на работу при машине для установления колец для ботинок и т. д.

Администрация идет работницам навстречу, но среди рабочих замечаются возражения тому, чтобы работница выполняла такую же работу как по квалификации, так и по оплате, какую выполняют они. **С. Осипович.**

(Минск, завод „Энергия“).

На этом заводе работают исключительно мужчины. В прошлом году была послана одна девушка—слесарь, но со стороны рабочих было к ней плохое отношение и ей пришлось уйти. Теперь иначе. Директивы партии по продвижению женского труда на квалифицированную работу начинают проводиться в жизнь. По договоренности с администрацией, на завод в порядке постепенности будут приняты 6 7 работниц — слесарей, окончивших ЦИТ, Профтехшколу. В январе—феврале будет послано около 3-4 женщин-слесарей, одна уже работает в качестве слесаря.

Таким образом, если со стороны рабочих будет товарищеское отношение к труду женщины, как квалифицированного работника, и если сами работницы будут стремиться получить квалификацию, то нам в дальнейшем будет легче проводить в жизнь директивы партии в этой отрасли.

Ванина.

Участие в производственном совещании.

(Минск, дрож.зав. „Пролетарий“)

У нас на заводе был поставлен вопрос (в последних числах января с-г.) о себестоимости и оформовке дрожжей. Это особенно заинтересовало работниц упаковочного отделения. Почти все работницы, за исключением некоторых, присутствовали на этом совещании.

Работницы активно выступали и отмечали, что у нас нет выра-



Клеельное отделени ф-ка „Дн

ботки сверх нормы, в то вре как на других дрожзаво имеется всегда приработок св нормы. Старший по упаковоч му отделению об'яснил это тем, имеется большой штат работ и это затрудняет подчас рабо так как дрожжерезки не успева вырезывать.

Работницы также отмечали, надо обратить внимание на

т. Рубенчик—токарь по металлу (Минск, зав. „Энергия“).

ПРОИЗВОДСТВЕ

ф-ка „Днепр“, Речица).

что у нас имеется два старших по упаковочному отделению, а на других заводах по одному старшему, и это тоже отражается на себестоимости. Кроме того, старшие не нагружены работой, как требуется.

Бывают времена, когда дрожжи не требуются, тогда приходится браться за другую работу, это--починка мешков, тут уже приходится дышать самым вредным воздухом (мешки очень грязные и пыльные) работницы работают, а старшие упаковочного отделения ходят руки в карманы.

Много еще недостатков указывали работницы и внесли предложение: сократить старших или дать им 100 проц. нагрузку. **Ц-ская.**

От редакции: Как - же разрешен был основной вопрос—как быть с тем, что упаковщицы не имеют полной нагрузки. Ждем писем работниц.

На общественной работе.

Большинство из женщин в Горсовете являются делегатками Женотдела прошлого состава. Когда их выбирали в делегатское собрание они отказывались, вследствие своей безграмотности. Теперь, слушая их отчеты о проделанной работе, о их знакомстве, кроме работы своей секции, с работой всего Горсовета в целом, о их знакомстве с задачами строительства хозяйства и культуры—чувствуешь как они выросли. Не верится как-то, что эти полные бодрости и понимания дела доклады исходят от тех бывших робких и неуверенных в себе женщин.

Выборы депутаток Горсовета вполне себя оправдали и дали нам еще несколько стойких, сознательных, практических работниц, которые на деле выполняют заветы Ильича

г. Витебск. **С. Черняк.**



Семальное отделение (ф-ка „Днепр“, Речица).

В партию—чтобы взять большую ношу в деле строительства.

(*Витебский округ, Высочаны*).

В Октябрьский призыв у нас на фабрике имени „Карла Маркса“ вступило в партию рабочих 38 человек, из них женщин 22; 16 из них делегатки старого или нового состава. „Надо поработать для партии и советского государства, поучиться как работать, чтобы быть примерным и руководить“—говорят товарищи, вступившие в партию.

Все поступившие, за малым исключением, посещают политкружок.

О. Макейченко.

(*Витебск, ф-ка „Двина“*).

Голос коммунистической партии в 10-ю годовщину Октября чутко откликнулся в сердцах работниц и нашей фабрики. За это время поступило в партию 90, женщин из них 23 делегатки Женотдела, 2 выдвиженки: помощница инструктора тов. Барановская и Рощенская, которые имеют 25 летний стаж работы в производстве.

М. Петровская.



Упаковочное отделение (ф-ка „Днепр“, Речица).

Работница, подымая свою грамотность и увеличивая квалификацию, ты станешь равноценным строителем социализма!

ДЭЛЕГАЦКІ СХОД--НАША ШКОЛА.

Дэлегацкія сходы ўмацоўваюцца, паглыбляючы практычную працу.

(Гарадоцкі раён на Віцебшчыне).

Да гэтага году ў нашым раёне і раней былі дэлегацкія сходы, але іх праца зусім не адчувалася, а ў гэтым годзе яны працуюць шмат лепш.

Распачалася праца Гарадоцкага сходу ў сьнежні месяцы. Дэлегаткі прымацаваны да розных установ, арганізавалі тры гурткі, а зусім нядаўна яшчэ з'арганізаваўся і Камітэт дапамогі зарубежным барацьбітам. Апошні шпарка разгарнуў сваю працу па зьбіраньню грошай шляхам пастаноўкі спэктакляў, збораў і інш.

З гурткоў найлепш працуе юрыдычны, дзякуючы таму, што ім кіруе тав. Лус — судзьдзя Гарадоцкага раёну—які аддаў нават свой дзень адпачынку, каб толькі было магчыма рэгулярна займацца з дэлегаткамі. Мы ўжо шмат чаго зразумелі і па алімэнтных справах, і па працоўнаму праву.

Амаль што ўсе дэлегаткі лічацца сябрамі МОПР'у, а таксама пастанавілі ўсім запісацца ў сябры Асоавіяхіма.

С. Кубліцкая.

Налаживается систематическая работа с общественницами.

(Витебский округ, Высочанский район).

Раньше в Высочанском районе почти никакой работы с общественницами не проводилось. Если созывали один раз в год конференции, то общественницы не собирались.

Но в 1927 году был сделан некоторый сдвиг: провели три конференции общественниц и благодаря хорошей подготовке на двух последних конференциях присутствовало 40—59 человек общественниц, делегаток и не делегаток.



т. Варунчукова, сял. Магіл. акр., старшыня сельсавету.

В последнее время намечено в плане проведение совещаний с общественницами по отдельным отраслям работы: членов сельсоветов, КСУ и т. д.

Последняя конференция, проведенная 8/I-28 г., прошла очень живо и показала, что женщина растет.

Из практических вопросов заслушали два доклада общественниц членов Сельсоветов. Костьевского с/с. Борковская Елена, неграмотная, 50 лет, выкачала в своей деревне весь налог в срок, составляла описи, привлекая для этого, как неграмотная, своих детей. Другая—член Кринковского с/с. Коновалова Матрена, 45 лет, малограмотная; посылалась Сельсоветом для улаживания семейных неурядиц, для составления актов по налогу и все поручения выполняла лучше и быстрей, чем члены сельсовета—мужчины.

О. Макейченко.

Калектыўна дапамаглі ўдаве-бяднячцы.

(Хаценскі с/с., Полацкай акругі).

У нашым сельсавеце ў вёсцы Галі сабраліся дэлегаткі і камсамольцы ды абмалацілі бяднячцы-ўдаве авёс і збожжа. Машыну даў бяз грошай Камітэт Сялянскай Узаемадапамогі.

Пабольш-бы такіх організаваных выступленьняў на грамадзкай працы.

Кацярына Трапач.

Упартай працай заваявала пашану з боку сялян.

Тав. Фралова—член Скуратаўскага с.-с. Ёй зараз 50 гадоў, але яна энэргічна прымае ўдзел у разьвязаньні ўсіх практычных пытаньняў. Па яе ініцыятыве шмат якім беднякам зьнялі падатак і зьвярнулі ўжо заплачанае. У вёсцы, ад якой яна зьяўляецца членам сельсавету, няма скаргаў на няправільнае разьмеркаваньне скідак па падатку.

Ліпак, член Цэн. Праўл. Саюзу Тэкстыльшчыкаў.

У савет яна, як казалі, абрана адным голасам, бо супроць галасавала адным меней чым за. Сваёй упартай працай заваявала аўтарытэт, усе кажуць, што не памыліліся, абіраючы яе ў сельсавет. З працай т. Фралова спраўляецца.

У сваёй хаце арганізавала Чырвоны куток, выпісваюцца газэты. Да Кастрычнікавай рэволюцыі яна сваю хату ўбрала зеленьню, вымыла падлогу, пасыпала дробным ельнічкам, так што старэнькая, маленькая хатка прыняла сапраўды сьвяточны выгляд.

Наогул, тав. Фралова дае добры прыклад як у галіне грамадзкай працы, так і ў быту.

Н.

Жывыя прыклады новага быту робяць вялікую справу.

(Бягомельскі раён на Меншчыне).

У вёсцы Нідаль сёлета першы год існуе дэлегацкі пункт. І, ня гледзячы на гэта, ён робіць вялікую жывую справу. Дэлегаткі шмат гутарылі пра новы быт і парашылі вясьці рашучую барацьбу супроць папа, рэлігіі і наогул супроць усяго старога, што перашкаджае ім у пабудове новага жыцьця.

Гутаркі былі недарэмнымі: дэлегаткі ў пілі-паўку не пасьцілі, каляд чакалі не з самагонкай і

малітвамі, а сумесна з ячэйкай камсамолу і настаўніцтвам рыхтавалі спэктакль антырэлігійны.

Якраз перад калядамі за тыдзень у аднэй дэлегаткі радзілася дзіцянё. Дэлегатка рашуча сказала, што дзіця папу не панясу, не знаходжу ў гэтым патрэбы. Мужык з ёю згадзіўся. У гэтай вёсцы яшчэ ня было выпадкаў, каб дзяцей ня хрысьцілі.

Калядамі наладзілі акцябрыны. Прадстаўнік партячэйкі зрабіў даклад, выступаў сакратар ячэйкі камсамолу, дэлегаткі, настаўніца і сяляне. І гэты вечар акцябрын зрабіўся багатым культурным вечарам.

О. Гайдук.

Навучыліся працаваць.

(Пятрыкоўскі р., Мазырск. акругі).

На агульным сходзе тры дэлегаткі рабілі справаздачу. Кожная з іх мела практычную працу:

Дэлегаткі, якія два-тры месяцы таму назад ня ўмелі двух слоў зьвязаць, цяпер ня толькі гаварыць, але і працаваць навучыліся.

Адна навярбавала больш 200 сяброў МОПР'а і арганізавала ячэйку МОПР, другая, будучы ў кооператыўнай камісіі, прымала ўдзел у зьніжэньні цэн і іншых галінах працы Савету, трэцяя апавядала аб працы сангуртка.

Н. Д.

Будем проводить в жизнь решения XV С'езда ВКП(б).

На Минском городском собрании делегаток выступала тов. Артюхина. Она произвела большое впечатление, дорогая и близкая нам, как все наши вожди, беспощадная к классовому врагу пролетариата и отдающая свою жизнь для блага трудящихся.

Доклад тов. Артюхиной об итогах XV-го С'езда ВКП ярко обрисовал, как Советская власть и партия заботятся о трудящихся женщинах. Задачи квалификации женского труда в производстве и переход на 7-мичасовой рабочий день, построение вечерних яслей и детских садов для смен и т. д. стали перед партией во весь рост. Много делегаток выступало в прениях.

В делегатской среде, руководимой нашей железной партией, нет сомнений в свои силы, и все мы будем проводить в жизнь решения XV С'езда нашей партии.

Делегатка **Гуревич.**

У першым складзе батрацкіх курсаў жанчын было ўсяго 6,5%. Зараз-жа—у другім складзе нядаўна адчыніўшыхся курсаў—жанчын ужо 20%. На фатаграфіі—спатканьне групы батрачак, прыехаўшых на курсы.

РАСКУПІМ ПАЗЫКУ ЎЗМАЦНЕНЬНЯ СЕЛЬСКАЕ ГАСПАДАРКІ.

Нідальскія дэлегаткі падпісаліся.

Хто будзе наступным?

На сходзе Нідальскага дэлегацкага пункту (Менская акруга, Бягомельскі раён) быў заслуханы даклад аб значэньні пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі. Дэлегаткі вынесьлі пастанову падпісацца кожнай дэлегатцы ня менш як на два з паловай рублі аблігацыі і прасоўваць аблігацыі ў гушчу сялянак.

На гэтым-жа сходзе прынясьлі грошы на падпіску 10 дэлегатак на суму 30 рублёў.

Гэта было 20 студзеня, калі ў нашым раёне ня было яшчэ пасьведчаньняў аблігацыі. Цяпер, калі часовае пасьведчаньне ёсьць, дэлегаткі паступова выконваюць сваю пастанову.

Г. О.

Выклікаюць дэлегацкія сходы ўсяго раёну.

На дэлегацкім сходзе Самахвалаўскага сельсавету 21 студзеня стаяла два пытаньні: аб хлебазагатоўках і аб пазыцы ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі.

На сходзе КОЛЕКТЫЎНА ПАДПІСАЛІСЯ НА 10-РУБЛЁВУЮ АБЛІГАЦЫЮ і пастанавілі выклікаць зрабіць гэта ўсе дэлегацкія сходы раёну.

КЛЁНІК.

ЖЕНА РАБОЧЕГО—ЗА УЧЕБОЙ.

Работа кройки и шитья—наша школа.

(Гомель, Залинейный район).

Кружок кройки и шитья при железнодорожном клубе имени Ленина начал свое существование с 8-го марта 1926 года.

Сейчас уже работает третий набор, как и первые два, состоящий из 100 человек, в возрасте от 20 до 40 лет.

Первое время в кружке учились работать только на одной машинке (ножной), доставленной Д.Т.П.О. Затем были приобретены еще три, правда, не новые. Теперь эти машины хорошо налажены и составляют гордость женщин, так как они заработаны самими членами кружка (брались заказы от железной дороги).

Кроме учебы шитью, кружок занимается и другой воспитательной работой. Несколько раз устраивались экскурсии кружка на суконную фабрику в Клинцы, в Добруш на бумажную. Затем местные экскурсии: в Красную армию, Полеспечать и др.

Женщины, окончившие курс кройки и шитья, умеют хорошо пошить не только мужское и женское (не говоря уже о детском) белье, но даже верхнее платье, костюм и проч.

Много хороших делегаток дал кружок Женотделу. Все члены кружка стали членами клуба. Многие вступили в ячейку МОПР'а.

Метод преподавания был школьный. Бегут наши женщины, как девочки, в школу, в клуб Ленина, в женский уголок, оторвавшись от своих домашних обязанностей. С линейками, с трубочками бумаги для чертежей, с тетрадками, у каждой карандаш, резинка, сантиметр. Без этого нельзя.

Руководительница об'ясняет, рисует на доске части выкройки, а ученицы записывают, перерисовывают.

Трудновато неграмотным, но им помогают и тут-же учатся они писать цифры и буквы (некоторые в кружке ликвидировали свою неграмотность, так как продолжительность курса—8 м-цев). Слушательницы в кружке учатся и политграмоте. **Тюфеева.**

Работа значительно улучшилась.

(Госкожзавод им. „Лекерта", гор. Могилев).

Работа среди женщин у нас на заводе за последнее время оживилась; женщин-работниц у нас мало, но жен рабочих—90 человек. При наличии работниц, конечно, легче втянуть в работу и жен.

Если женорганизатор интересуется своей работой, то работу среди жен рабочих можно проводить с успехом. В начале 1927 года трудно было привлечь жен к посещению собраний, но постепенно они заинтересовались собраниями, стали посещать, выступают в прениях и дают довольно ценные указания по тем или иным вопросам.

Женорганизатор тов. Дымкова сумела втянуть жен в пайщики кооперации и мы имеем 67 пайщиков жен рабочих, помимо того, что мужья также состоят пайщиками.

Организован политкружок, который посещают 12 жен. Журнал „Беларуская Работніца і Сялянка" раньше не выписывался, а в настоящее время насчитывается 44 подписчицы. На ряду с этими большими достижениями, необходимо указать на более регулярное проведение общих собраний, которыми жены заинтересовались.

М. С.

Гурток кройкі і шыцьця.

НЯПІСЬМЕННАСЬЦЬ--НАШ ЗЬЛЕЙШЫ ВОРАГ.

Ня гледзячы на цяжкасьці—змагаемся з цемраю.

Жаданьне вучыцца, ліквідаваць няпісьменнасьць у сялянак надзвычайна вялікае. Па аднаму, напрыклад, нашаму раёну вучыцца ў лікбезе 372 сялянкі. Гэта нас вельмі радуе. Гэта паказвае, што распачата самая рашучая барацьба з цемраю, някультурнасьцю.

Але на гэтым сонечным і цяжкім шляху шмат перашкод. Гутарыш з сялянкамі і чуюцца скаргі такія:

Пузанкова, сял. Магіл. акр., член ЦВК БССР.

I. „Калі я не пайду ў лікбез, дык мне здаецца, што я чыню злачынства і неяк адчуваю сябе нядобра, пачынаю злаваць і лаяцца на дзяцей, мужа, якбы яны ў гэтым вінаваты. А бываюць выпадкі, што пры ўсім жаданьні ня маю магчымасьці пайці ў лікбез. У хаце адна, трое дзяцей, жывём бедна, муж езьдзіць у заработкі. На маіх руках—дзеці, печ, скаціна, муж прыяжджае позна. Вось і нялёгка тут выкрасьці гадзіну якую пайці ў лікбез“—кажа сялянка вёскі Бярэзіна.

II. „Няпісьменная, запісалася ў лікбез. Наведваю. У хаце нас тры жанчыны. Дзіцянё ў мяне адно. Можна найці вольную часіну. Але муж у мяне неспагадны. Прыдзеш дамоў, дык і пачынаецца „лазьня“. Лейцы на круку. Мужык пачынае: Дзе была? Настаўніцай усё роўна ня выйдзеш. Добра, калі ўцяку, а не, дык і добра ўзгрэе. Ды ці хочацца-ж па судох хадзіць. Так і плаціш за лікбез сваім гарбом“—кажа сялянка вёскі Запольле.

І многа іншых перашкод, якія патрабуюць ад сялянкі шмат мужнасьці, каб усе іх перамагчы і рашуча пракладваць дарогу да сьветлага будучага.

М. Бягомель, на Меншчыне. **Г. О.**

Будзем жыць пановаму.

(В. Боркі, Вузьдзенск. р-ну, Менск. акругі).

Лікпункт у нашай вёсцы зьяўляецца важным культурным асяродкам. Цераз яго нам удаецца прыцягнуць і жанчын да ўдзелу ў грамадзкай працы. На лікпункце 46 слухачоў, з іх 39 жанчын. Апрача звычайных заняткаў мы прыцягваем сялянак да працы ў гурткох, якіх у нас два: драматычны і сельска-гаспадарчы. Нядаўна сіламі драмгуртка быў пастаўлен у часе калядных сьвят спэктакль з дэклямацыяй і гульнямі. Вечар прайшоў пры дружным удзеле сялянак. Пры лікпункце выдаецца і насьценгазэта, у якую пішуць самі слухачы лікпункту.

Праводзім вечары самадзейнасьці.

Я. Банькоўскі.

Бабруйскі раённы зьезд батрачак.

За колектывізацыю сельскай гаспадаркі.

„У сучасны момант задача аб'яднаньня і ператварэньне дробных сялянскіх гаспадарак у буйныя колектывы павінна быць пастаўлена галоўнай задачай партыі ў вёсцы“,—вось наказ XV партзьезду.

Усе беднячкі, сераднячкі, актывісткі павінны дапамагчы правесьці гэту задачу ў жыцьцё.

Дэлегаткі, будзьце ў першых шэрагах па калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Організоўвайце малочныя таварыствы, засявайце калектыўна агароды, набывайце колектыўна сэпаратары. Гэтым вы пакажэце ўсім сялянкам, як трэба змагацца за новую вёску.

Инв. 1953 г. БА 826

Борьба за грамотность, борьба с пьянством, самогоно-курением, борьба с невежеством и предрассудками, со всем тем, что еще осталось нам в наследство от старой России—вот одна из главнейших задач партии и власти.

Мы победим и на этом фронте также, как побеждали и на других.

РОСТКИ НОВОГО БЫТА.

Через жилищную кооперацию улучшаем свой быт.

На страницах нашего журнала уже освещалось значение жилищной кооперации, значение участия в строительстве жилкооперации трудящихся женщин.

Одной из задач жилкооперации является улучшение быта трудящихся женщин через открытие детучреждений, прачешных. Жилкооперация должна вести культурную работу среди своих членов. Как-же она выполняет эти задачи?

Помощь матери.

В ЖКТ'е довольно широко развернулась работа по организации детских садов и площадок. Летом 1927 года было организовано 32 детплощадки с 240 детьми. На сегодняшний день имеется 75 детсадов. Средства на организацию этих учреждений дают ЖКТ'ы и сами родители.

Белжилсоюзом организованы 6-ти недельные курсы, где матери—члены ЖКТ получат необходимые сведения о воспитании детей. Женщины—члены ЖКТ — втягиваются в различные общественные организации: МОПР, Друг детей, Осоавиахим. — При ЖКТ'ах организованы ячейки всех этих добровольных обществ. В ЖКТ существует не один десяток Красных и санитарных уголков, где проводится культурно-просветительная работа среди женщин.

Дальше. Хоть мало все-ж ЖКТ'ы кое-что делают и для оздоровления жилищных условий. В некоторых ЖКТ'ах выстроены специальные помещения под прачешные, где в установленном порядке каждая хозяйка — член ЖКТ — проводит стирку. Таких прачешных по всей Белоруссии—10. А это очень важное и нужное начинание, которое всячески надо расширять, чтобы не надо было стирать на кухне. Понятно, что при стирке на кухне и пар от грязного белья идет в кушанье, и дети подчас топчутся в грязной воде и т. д.

А на фронте ликвидации неграмотности надо подтянуться.

В настоящее время при ЖКТ'е работает 30 ликпунктов, в которых обучается 300 человек. Правда, это число очень невелико, надо подтянуться, тем более, что среди жен рабочих неграмотность очень велика. Ведь на поселке, в ЖКТ, все благоприятные условия для организации ликбеза. Не надо далеко ходить в ликпункт; время занятий при ЖКТ, на поселке, можно приспособить к свободному часу матери-хозяйки.

Участие женщин в строительстве Жилкооперации.

Число женщин в выборных органах Жилкооперации растет. В 1926 году в Правлениях женщин было 88 человек или 5,1 проц. В 1927 — уже 108 или 9,9 проц. Растет также количество женщин в Правлениях ЖКТ: в 1926 году было 76 человек или 4,5 проц., а в 1927 году уже 138 или 5,4 проц.

В некоторых округах: Минск, Бобруйск, Борисов были проведены конференции жен рабочих, которые много помогли поднятию активности членов ЖКТ женщин.

Так, шаг за шагом внедряются кусочки нового быта в рабочую семью.

Имеющиеся достижения в Жилкооперации в области культурно-бытовой работы это только первые шаги, работа начала развертываться совсем недавно. Много работы еще впереди.

В улучшении быта работниц и жен рабочих, в поднятии грамотности и культурности членов ЖКТ женщин—непочатый край работы.

Особенное внимание надо обратить на ликвидацию неграмотности, на прививку санитарно-гигиенических навыков в рабочей семье, чтобы в ней было чище, культурнее.

Надо шире организовать детучреждения, которые развязали бы руки матерям. Надо шире итти по линии постройки прачешных, надо подумать и об общественном питании.

Женщины—члены ЖКТ—должны еще больше усилить свое участие в работе разных общественных организаций. Еще больше уделить внимания работе по военизации.

Все эти задачи, стоящие перед Жилкооперацией, под руководством партии будут ею выполнены, если все члены ЖКТ, если трудящиеся женщины проявят еще больше активности, примут большее участие в работе Жилкооперации.

Гольдвассер.

БУДУЕМ КООПЭРАЦЫЮ.

Дэлегаткі паляпшаюць працу коопэрацыі.

(Бягомель, на Меншчыне).

У 1927 годзе ў Мевезіцкай спажывецкай коопэрацыі былі зроблены перавыбары праўленьня. Дзякуючы „добрым" ранейшым працаўнікам коопэратыў мэў дэфіцыту і растрат на 12.000 рублёў. Новаму праўленьню трэба было ўзяцца за працу з усіх сіл, каб справу наладзіць.

Парашылі падшукаць добрага прыказчыка. Гэткага нашлі. Добра, спраўна гандлюе тав. *Чарткоў*. Акуратна адважвае, адмервае, захінае клуначак, умела прыгатуе тавар. Пайнікі здаволены: а можа пасьля шэрагу растрат пачне даваць коопэратыў прыбытак?

Гэтак было спачатку, пакуль тав. *Чарткоў* ня быў знаём з мясцовымі паненкамі-нэпманкамі. А пазнаёміўся і дэлікатнасьць пайшла ў другі бок. *Чарткоў* у базарныя дні ўгаварваў пакупшчыкаў пачакаць, марудна адважваў, адмерваў, вылічваў, каб затрымаць людзей і гэтым даць магчымасьць поўным ходам гандляваць свайму цесьцю-нэпману.

Акрамя таго, *Чарткоў*, каб больш пасьпешна рэалізаваць тавары, больш ходкія пачаў перадаваць цесьцю.

Дэлегаткі, якія больш часьцей наведваюць лаўку, пачалі заўважаць гэтыя выпадкі і пільна сачыць за працай спэца *Чарткова*. Знайшлі падцьвярджэньне гэтага фактамі. Пачалі гаварыць аб гэтым на дэлегацкім сходзе. Паставілі пытаньні перад адпаведнымі органамі, і ў выніку ўсяго гэтага *Чарткоў* з працы зьнят, і справа перадана сьледчым органам.

Сялькорка.

Значнае павялічэньне жанчын у праўленьнях коопэратываў.

(Бягомель, на Меншчыне).

Перавыбары праўленьняў коопэрацыі ў раёне прайшлі з узросшай актыўнасьцю сялянак. Па асобным коопэрацыям процант прысутных на выбарчых сходах узрос прыблізна на 12—15 проц. у параўнаньні з мінулым годам, а ў некаторых да 20 проц. У мінулым годзе амаль-што ніводнай сялянкі ня было абрана на актыўную працу ў коопэрацыі, за выключэньнем некалькіх настаўніц і служачых, якія былі абраны ў склад рэвізійных камісіяў. У гэтым годзе мы маем (па няпоўных вестках) у складзе ўпаўнаважаных каля 40 чалавек, у складзе праўленьняў і рэвізійных камісіяў—12 чалавек. Бязумоўна, гэта нязначная лічба ў параўнаньні з агульным лікам абраных, *але-ж гэта значнае павялічэньне ў параўнаньні з мінулым годам.* Актыў абраных сялянак не прайшоў і першай ступені грамадзкай працы і загэтым патрабуе ад нашых партыйных і коопэрацыйных арганізацый належнага выхаваньня. Трэба будзе пэрыодычна склікаць іх на нарады, даручыць ім тую, ці іншую працу, больш уважліва адносіцца да іх уцягненьня ў працу.

О. Гайдук.

Директива выполнена.

(Ст. Витебск МБВ ж. д.).

У нас на узле всех женщин, считая и работниц и жен рабочих, числилось по спискам Т. П. О. 104 челов., а женщин на узле имеется до 2-х тысяч.

Женкомиссия при Бюро К-ва КПБ(б) занялась и к 8 марта постановила: *во что бы то ни стало довести кооперирование работниц и домохозяек до 500 чел.* За работу взялись горячо. Поставлен вопрос о выделении фонда для льготного кооперирования работниц и служащих, получающих содержание до 6-го разряда и домохозяек, мужья которых получают по тому же разряду.

Результаты сказались. Вместо 104 человек в прошлом году, мы теперь имеем 897 чел. и это на 1-е января, думаем, что к женскому дню будет еще больше.

Теперь у нас с пайщицей считаются, как с определенной силой. Маленький пример: Недавно выяснилось, что работница не может получить недостающие продукты, так как время продажи не приспособлено ко времени работы на предприятии. Делегатки постановили, что для работниц надо установить послеобеденное время и выделить для этой цели один магазин. Это постановление проведено в жизнь.

Пайщица **Славина.**

Масларобчы завод—скарбніца сялянак.

ДИФТЕРИТ

Дифтерит относится к группе заразных болезней. Заболевание дифтерией происходит от заражения дифтеритной палочкой, видимой только через увеличительное стекло. Дифтеритная палочка проникает в наш организм, главным образом, через рот и нос, но она может также поселиться и на ранах, в ушах, глазах и на половых частях у девочек. Источниками распространения дифтерии служат больные, а также выздоравливающие и те здоровые, у которых поселилась (чаще всего во рту) дифтеритная палочка.

Дифтеритная палочка находится не только у больных и выздоравливающих, но и у тех лиц, которые имеют соприкосновение с больным. Эти люди могут сами не заболеть дифтерией, но палочку они разносят. Дифтеритная зараза может сохраниться в зеве или носу выздоравливающего или здорового в течение нескольких месяцев.

Передатчиками дифтерии могут служить еще предметы, бывшие в употреблении у больного, а также и самое помещение, в котором находился больной. Некоторые религиозные обряды (напр., целование креста, причащение), общая посуда могут также служить источниками заражения дифтеритом.

Чаще всего дифтеритом заболевают дети. В то время, как при кори и скарлатине, вторичное заболевание бывает очень редко, заболевание дифтеритом может повторяться.

Как протекает заболевание дифтерией?

От момента заражения до дня проявления болезни проходит 2—7 дней. Температура (жар) тела во время болезни чаще всего бывает 38°, 39°, а иногда и 40°. Бывают случаи, что температура совсем не повышается.

В зеве мы видим желтоватые налеты (на миндалинах и язычке). В грудном возрасте часто дифтерия наблюдается не в зеве, а в носу, откуда выделяется слизисто-гнойная и слегка кровянистая жидкость. Дифтерия гортани следует за дифтерией носа или зева или же она начинается сразу с самой гортани. При дифтерии гортани мы наблюдаем все признаки стеснительного дыхания (хрипота, недостаточность воздуха, беспокойства и проч.).

Если-же дифтерия сразу начинается в гортани, то тогда не видно пленок в зеве и в носу. Бывает, что к дифтериту присоединяется и другая болезнь (осложнение): воспаление легких, параличи, воспаление уха и проч.

Главное лечение дифтерита это противодифтеритная сыворотка. Ее приготовляют из крови лошадей. Сыворотка обезвреживает яд, выделяемый дифтеритной палочкой. При лечении сывороткой смертность значительно понижается. Когда еще не было сыворотки, умирало из 100 больных детей—40, теперь же из каждой сотни умирает около 12. Если сыворотка прививается больному в первые два дня болезни, то смертность еще ниже.

Больных и подозрительных по заболеванию дифтеритом детей необходимо отделить, лучше всего поместив в больницу. Ребенка, болевшего дифтеритом, можно пускать в школу только через 14 дн. со времени выздоровления. Там, где есть бактериологическая лаборатория *) лучше всего три раза исследовать слизь болевшего. Если при этом дифтеритная палочка не будет обнаружена, ребенка в школу можно пускать. Братья и сестры больного не должны посещать школы 14 дней.

Если сделать прививку противодифтеритной сыворотки детям, соприкасающимся тесно с больными дифтерией (в небольших количествах, а это знает врач), то тогда есть большая надежда, что эти дети не заболеют.

Помещение, где находится больной и вещи, к которым он прикасается служит источником заразы, а потому все это должно быть тщательно продезинфецировано.

Лечение.

Каждый должен помнить, что во всем, когда есть подозрение на заболевание дифтеритом, необходимо, как можно скорее, обращаться к врачу. Своевременное распознавание болезни ведет к своевременному лечению, а от него и зависит выздоровление больного. Противодифтеритная сыворотка дает наилучшие результаты в первые дни болезни. Дифтерию лучше лечить в больнице.

Чистота помещения, чистый воздух и хороший уход много помогают в излечении от дифтерита. Больной должен обязательно иметь отдельную посуду, которую нельзя мыть с общей, домашней посудой. Больной должен находиться в кровати во время болезни и после очищения зева в течение 8-ми дней. Пища в первые дни болезни должна быть жидкой: молоко, какао, чай с молоком, кофе, бульон, фруктовые соки. Кормить больного надо небольшими порциями, выздоравливающим необходимо прибавить кашу, компот, картофельное пюрэ, моченые в молоке или чае сухари, пюрэ из овощей, печеное яблоко и проч. Игрушки больного не должны попадать в руки других детей, по выздоровлении лучше всего их сжечь.

Мать, помни, что только врач может помочь твоему ребенку. Не обращайся к бабкам, знахаркам и тетушкам. Провозишься с бабками—потеряешь дорогое время, необходимое для лечения дифтерии сывороткой.

Д-р **Альшванг.**

---

*) Лечебное учреждение, где исследуется кровь и выделения больного, чтобы установить, какою болезнью одержим.



А. ТЫСЫНА.

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА.

Як вырашчваць цялят.

Каб сяляне з большай зацікаўленасьцю і ахвотай вырашчвалі цялят правільна, трэба праз малочную коопэрацыю палепшыць прыбытковасьць малочнай справы.

Дзе нашы вёскі завялі коопэрацыйную пераапрацоўку і збыт малочных прадуктаў, там гадоўля малочнага быдла вядзецца пасьпяхова; каровы правільна кормяцца і дояцца; ад добрых кароў атрымоўваецца добры маладняк і ён правільна вырашчваецца (узгадоўваецца).

І ў такіх вёсках ёсьць вялікія гурты малочнага скоту.

Догляд каровы перад ацёлам.

Ад кожнай дойнай, з тлустым малаком, каровы неабходна пакідаць на гадоўлю цяляты, як цёлачак, так і бычкоў, бо з першых будуць добрыя каровы, а з другіх бычкі.

Каб атрымаць ад добрай маткі здаровае цялё, трэба другую палову цельнасьці яе добра карміць, а за 6 тыдняў да ацёлу запусьціць яе; гэта важна дзеля таго, каб карова не слабела, каб плод добра разьвіўся, каб наступны ўдой ня быў ніжэйшы.

Догляд за цялём у першы дзень.

У новароджанага цяляці трэба нос і вушы ачысьціць ад сьлізі; пасьля гэтага паднесьці да маткі, каб яна аблізала, пры чым трэба сачыць, каб карова не захапіла языком пупавіну і не абарвала яе, ад чаго бывае грыжа. Гэту пупавіну патрэбна абрэзаць на 2-3 пальцы і замазаць пупок.

Калі матка не аблізала цялё, трэба самому выцерці да суха саломай. Пасыпаць чым-небудзь цяля і гэтым прымушаць карову аблізаць яго ня варта, гэта шкодна.

Як гадаваць цялё ў першыя тыдні.

Цялё лепш гадаваць адсадзіўшы зусім ад маткі і выпойваючы з даёнкі паводлуг нормы. Пры такім спосабе гадоўлі лягчэй захаваць цялё ад псоты ці здыханьня.

У першую чаргу цялё павінна атрымоўваць тры разы ў дзень малодзіва на 1-2 хунты за раз (у залежнасьці ад росту). Малодзіва каштоўна тым, што яно ачышчае кішкі ад палу, што насабіраўся за час утробнага жыцьця.

Карова пасьля ацёлу доіцца праз 4—6 гадзін. Цяляці трэба даваць малако з даёнкі цёплым, сьвежым, здаровым, даёнка павінна быць чыстай. Пасьля паеньня морду цяляці трэба выцерці, каб ня завялася „малочніца"—хвароба, падобная на лішай ці экзэму.

Каб папярэдзіць цялят ад хвароб, раіцца ўжываць наморднікі, які перашкаджае ім лізаць усё навокал, есьці падсьцілку. Такія наморднікі ў некаторых мясцох ужываюць даўно ўжо.

Спачатку цялё пояць ў залежнасьці ад яе вагі разьлічваючы так, каб у першы тыдзень давалася столькі хунтаў малака, колькі хунтаў складае $^1/_6$—$^1/_7$ частка жывое вагі цяляці. Затым павялічваюць штодня і да канца 4 тыдню порцыю малака, даводзячы яе да 20—25 х.

Калі пачынаць прывучаць цялё да звычайнага корму.

Пасьля 4-х тыдняў частку цэльнага малака замяняюць зьнятым, дабаўляючы $^1/_2$ х. аўсянкі ці макухі. Пасьля 3 тыдню цяляці даюць у волю далікатнага сена.

На восьмым тыдні і зьнятае малако паступова замяняецца пойлам. Калі зьнятае малако таннае, дык карысна даваць яго цяляці як мага даўжэй.

На 9, 10, 11 і 12 тыдні даецца цяляці ў дзень 20—30 х. чыстай цеплаватай вады з 3—4 хун. аўсянкі і добрага сена ў волю.

На 4 месяцы пойла замяняецца сухім кормам (харчыю), а вада даецца асобна. Побач з кормам у пойла трэба прыбаўляць штодня некалькі грамаў (6—8) солі і трошкі паленай тоўчанай касьцяной мукі.

Цялят трэба чысьціць і пускаць іх на спацыр, каб яны пагулялі, раскурсталіся.

Трэба пільна сачыць за здароўем цялят і пры першых адзнаках хваробы (панос, запор) небходна ўлепшыць дагляд і харчаваньне.

П. Л.

Дэлегаткі організуюць с.-г. гурток.

(Пухавіцкі с.-с., Мазырск. акругі).

Да гэтага году ў вёсцы Ляховічы ня было ніякае працы сярод жанчын. Было так глуха і цёмна, як у восенскую ночку. Цяпер-жа праца пачынае разгортвацца. Заняткі з дэлегаткамі вядуцца рэгулярна два разы ў месяц. Зацікаўленасьць да працы вялікая.

Выдзелены і ўжо працуюць прадстаўніцы ад дэлегатак у кожнай установе на тэрыторыі сельсавету. Зорганізавалі сангурток. І на занятках, 18-га сьнежня вынесьлі пастанову, каб абгаварыць на агульным сходзе сялян пытаньне аб арганізацыі с.-г. гуртка.

Гэта вялікае дасягненьне ў нашым глухім кутку, калі сялянкі становяцца штурхачом у справе паляпшэньня дабрабыту ўсяе вёскі.

Невад.

Якая карысьць ад попелу і колькі яго можа назьбірацца ў аднэй хаце.

Попел зьяўляецца ўгнаеньнем. У нас угнаеньняў вельмі мала, а якія ёсьць пад рукамі, дык ня ўсякі клапоціцца скарыстаць іх. Нашым сялянкам, якія штодня выграбаюць з печы шмат попелу, трэба ведаць, што выкіданьне попелу ёсьць выкідваньне грошай. Дасьледвана практычнымі гаспадарамі, што 60 пудоў попелу дае на аднэй дзесяціне прыбытку ўраджаю бульбы да 300 пудоў. У кожнай сялянскай хаце можа назьбірацца 10-30 пудоў попелу. 30 пудоў хопіць на поўдзесяціны і дасьць прыбаўку ўраджаю бульбы на 150 пудоў; лічачы па 20 кап. пуд бульбы, выходзіць, што 30 руб. атрымалася з попелу.

Зьбірайце сялянкі попел! Вясною ён прыгодзіцца на гароды вам!

АДКАЗЫ НА ЗАПЫТАНЬНІ.

Ад чаго каровы грызуць ці ліжуць сьцены?

(запытаньне *Марылі Вішнеўскай,* Полацкай акругі, Асьвейскі р.).

Гэта бывае, калі жывёлам не даюць солі і мелу (крэйды). Асабліва цельным каровам трэба дабаўляць у корм солі і мелу. Маладым жывёлам у першыя месяцы жыцьця гэта дабаўка проста неабходна дзеля разьвіцьця касьцей і здароўя.

Як пазнаць, ці хутка будзе ацёл?

(запытаньне *Зіны Карсавінай,* Менская акр., Самахвал. р., Крупавіцкі с.-с.).

За тры тыдні да ацёлу вымя пачынае рабіцца грубым. Калі вымя хутка грубее, набухае і з яго сыскоў выціскваецца белае малако, дык значыць, што ацёл наступіць хутка.

Які ацёл лепшы: вясновы ці зімовы?

(запытаньне *Ганны Карэнінай,* Мазырская акр.).

Для гаспадаркі асеньні і зімовы ацёл кароў выгаднейшы, асабліва там, дзе ёсьць добры збыт малака, бо цэны на малако ў гэты час стаяць высокія. Пры вясеньнім ацёле наадварот—бывае шмат малака пры нізкіх цэнах. Перад асеньнім ацёлам каровы за лета добра паправяцца і вырасьцяць свой плод, а за зіму цялё падгадуецца і добра скарыстае пашу.

Сялянка, памятай, што актыўнай дапамогай партыі і Сав. уладзе ў кампаніі хлебазагатоўлі, у распаўсюджваньні пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі—ты выяўляеш сваю сьвядомасьць у Міжнародны Жаночы Комуністычны дзень!

Задача гаспадарчага ўздыму бядняцкіх гаспадарак і іх усё большае вызваленьне ад залежнасьці кулакоў можа быць з посьпехам вырашана тады, калі разам з організацыйна-палітычнай работай сярод беднаты асноўная ўвага партыі будзе накіравана на аб'яднаньне паасобных бядняцкіх гаспадарак у колектывы.

(З пастановы 11-га зьезду КП(б)Б).

ЧАСОПІСЬ—ШЫРОКІМ МАСАМ.

Гурток прыхільнікаў „Бел. Раб. і Сял.“—за шырэйшае распаўсюджваньне часопісі.

У Гарадку, Віцебскай акругі, працуе гурток прыхільнікаў „Беларускай Работніцы і Сялянкі“. Зараз выпісвае часопісь 36 дэлегатак, што дае каля 50 проц. усіх дэлегатак. Гурток мае на мэце разгарнуць яшчэ шырэй распаўсюджваньне падпіскі на часопісь. **С. Кубліцкая.**

Ад рэдакцыі. Тав. Кубліцкая, просім напісаць больш падрабязна аб працы гуртка.

Падпіска павялічылася ў 7 разоў.

Кампанія двухтыднёвіка „Беларускай Работніцы і Сялянкі“ прайшла наступным парадкам: на кожным дэлегацкім сходзе і гуртках рукадзельля былі пастаўлены даклады аб значэньні часопісі і ўдзелу ў ёй жанчын. Пры кожным дэлегацкім сходзе, а таксама гурткох рукадзельля былі вылучаны ўпаўнаважаныя па вярбоўцы падпісчыкаў. У выніку кампаніі маем наступнае: завярбована 88 падпісчыкаў па раёну, з якіх 56 індывідуальна і 32 калектыўна. А да кампаніі падпіска на часопісь стаяла слаба: выпісвалася ўсяго 12 экзэмпляраў.

Паўдаўцы выпісалі для сваёй вёскі 8 часопісяй.

На дэлегацкім сходзе вёскі Паўдавіч (8 студзеня), дзе прысутнічала 29 дэлегатак і 27 не дэлегатак, была пастаўлена справаздача ўпаўнаважанага па вярбоўцы падпісчыкаў на часопісь. У выніку чаго маецца наступнае: калектыўна для дэлегацкага сходу выпісана на 5 месяцаў і тры індывідуальна, для лікпункта выпісалі на чатыры месяцы таксама калектыўна. **Х. Лычкоўская.**

А вот на „Спартаке“ плохо: на 150 работниц—2 журнала.

На бумажной фабрике „Спартак“ гор. Шклова работает 150 работниц. Из них 25 коммунисток и 35 комсомолок. При фабрике организовано делегатское собрание в 62 делегатки из работниц и жен рабочих.

А вот спросите—сколько они выписывают нашего родного журнала „Беларуская Работніца і Сялянка“,—ни одного, за исключением на всю фабрику двух экземпляров, выписываемых для клуба и партколлективом для женработника. **А. Алексеева.**

Заг. райпошт. аддзяленьнем за распаўсюджваньнем часопісі.

У калядныя сьвяты прыяжджаў да нас, у вёску Панкратавічы, загадчык Шчэдрынскай паштовай канторай, тав. Мордас, і правёў шэраг гутарак. Азнаёміў нас з часопісьсю „Беларуская Работніца і Сялянка“. Некаторыя зацікавіліся часопісьсю і, склаўшыся, выпісалі тры нумары.

Ганна Дарафеева.

Просьба к читательницам—писать и в дальнейшем о том, как журнал распространяется, что в нем читательниц наиболее интересует, что надо улучшить и т. д.

ЧИТАТЕЛИ—О РАССКАЗЕ „МОДНИЦА“:

К ЧИТАТЕЛЯМ: печатается ниже ряд мнений о рассказе „Модница“, помещенном в № 12 нашего журнала, редакция просит высказаться по этому вопросу дальше. Мнение редакции будет помещено в одном из ближайших номеров.

Нужно одеваться поскромнее, но чисто и тепло.

При самых тяжелых условиях необходимо себя содержать в чистоте. Одежду—факт, мы должны носить поскромнее, но чтобы было чистенько и тепло. И никогда не нужно засматриваться на безумные, роскошные наряды других. **Потехина.**

Больше внимания питанию и физкультуре.

Я хочу поделиться своим мнением о том, что такое зло, как эти проклятые моды много губят молодежи. Возьму пример со своей фабрики „Спартак“ г. Шклова, Могилевского округа.

Есть комсомолки, которые по 8—12 месяцев не платят членские взносы, союзные комсомольские дни не посещают, не ведут никакой работы, не выписывают газет и журналов, **а только и смотрят, чтобы лучше нарядиться.** Моды это зло, которое загоняет все разумное, полезное молодежи на задний план. Комсомольской организации нужно среди молодежи повести широкую работу—борьбу с этим. Необходимо разработать и ставить инсценировки на эту тему, доклады врачей о сохранении здоровья. Больше внимания **питанию и физкультуре,** чем этим тряпкам.

А. Алексеева.

„Модніцы“ ёсьць ня толькі ў горадзе, але і ў вёсцы.

У апавяданьні „Модніца“ метка вызначан дружны фронт маткі з дочкамі супроць зусім хворага бацькі, які пярэчыў не таму толькі, што ня любіў мод, а таму, што маемасьць рабочага не дазваляе гнацца за модамі. Матка і дочкі згаджаюцца жыць на чэрствым хлебе, накрывацца тым, чым накрываюць кадушкі ў склепе і самі нават шчыра згаджаюцца жыць угаладоўку, але каб толькі не адстаць ад „апошняй моды“.

Гэта факт сёньнешняга дню, і вы спаткаеце гэта даволі часта ня толькі ў горадзе, але і ў вёсцы.

Ржэвуцкі.

Нам нужно быть только здоровыми.

Рассказ „Модница“ ставит вопрос вполне правильно, потому что и сейчас есть многие товарищи, которые гонятся за всякими модами и фасонами, а на пропитание нехватает жалованья. Моды и фасон—остатки от мещанства и дворянства, а нам все это нужно забывать. Нам нужно только быть здоровыми и учиться, чтобы уметь участвовать в строительстве нового хозяйства и научиться управлять государством, как тов. Ленин учил. Я думаю, что лучше будет, если мы, рабочая масса, будем не по-модному одеваться, а по-рабочему.

Домработница **Рудина.**

ВЯСКОВЫ БЫТ.

За картамі марнуюць час.

(Вёска Валоўнікі, Койданаўскі раён).

Дзяўчаты вёскі Валоўнікі дык не адстаюць ад хлапцоў з гульнёй у карты. Яны больш усяго гуляюць у сьвяточныя дні, і за картамі праседжваюць цэлы дзень. Пры гульні ў карты яны ўмеюць лаяцца ня горш за хлапцоў. Вось які адпачынак і занятак нашых дзявок.

Нам трэба, каб Путчынская ячэйка ЛКСМБ, дагаварыўшыся з жаночым аддзелам, узялася за гэтую справу і дапамагла дзяўчатам заняцца больш карыснай справай.

Сялькорка **Надзя.**



Вось да чаго даводзяць карты...

Жывасілам сапсавалі сялянцы вока.

Кастрычнік месяц, гэта той час, калі нашы вясковыя сялянкі апрацоўваюць лён на кудзелю, сушаць у лязьнях, а потым труць і г. д.

Вось у гэты час сялянка вёскі Цяплухі, Зборскага с/с. *Ляшчук П.*, тручы лён, запарушыла сабе вока і замест таго, каб парушыну гэту дастаць з асьцярогай ці прамыць чыстай вадою, яна дала тут-жа жанчынам бруднымі рукамі і фартуком паглядзець у вока і працерці.

Потым зьвярнулася да варожкі *Зьдзешчыц Аксіньні,* якая выварожыла на карты. „Вока тваё забалела, не ад таго, што ты кажаш, а ад могілак. Ты ішла ля іх і спужалася; вось яно і табе і баліць, кепскага няма нічога, дома вылечыш; нікуды ня едзь, шукай толькі тут жанчыны чорнага воласу, яна табе вылячыць і, як сьвят дзень, будзе ўсё, добра, я табе кажу: карты мае ўсю праўду паказваюць".

Не паслухала Ляшчук парадаў добрых людзей, каб зьвярнуцца хутчэй да дактароў, а пачала шукаць шаптух і знайшла такую *Галену Вешняк*, якая лячыла шэптамі да яшчэ і наліла ў вока самагонкі, ад чаго і пагоршала, а на другі дзень зьявіўся нарыў. Што далей, то ўсё горш.

Пасьля 7 лістапада едзе Ляшчук у Гомель шукаць спэцыялістых вылечыць сваё вока, боў Асіпавічах і Бабруйску зрабіць нічога не маглі.

Калі Ляшчук П. прыехала ў Гомель, у больніцы пачалі глядзець, што з яе вокам: знашлі шмат сьмецьця і кусочкі цукру, які яшчэ не растаяў, што засыпалі ёй дома (чаго толькі ня было, нават і топленае сала з зайцаў залівалася ў балючае вока).

Пасьля хатніх лекаў, якія цягнуліся доўгі час, мала памаглі ўсе стараньні, лячэньне і апэрацыі ў Гомлі ў працягу 5 тыдняў. Ляшчук зьвярнулася дамоў з папсаваным вокам.

У вочнай клініцы ёй параілі прыехаць праз 5 месяцаў, калі супакоіцца балець вока, для здыму з яго бяльма.

Жанчына.

СОВЕТЫ ХОЗЯЙКЕ.

Жареная баранина.

Для жарения большим куском лучшая часть баранины это—задняя нога, для малого семейства берут переднюю ногу или почечную часть. Баранину моют, вытирают досуха полотенцем, срезают весь жир, солят, кладут на толстый противень на лучинки, сверху поливают растопленным маслом, на дно подливают немного бульона или воды и ставят жариться в горячую печь или духовой шкаф средней температуры. По желанию баранину перед жарением шпигуют чесноком или свиным салом или кладут на ночь в маринад. Особенно это необходимо, если для жаркого взято мясо от старого барана. Кислота размягчит волокна мяса.

В маринад из уксуса для баранины берут на каждые полтора литра уксуса средней крепости 1½ стакана воды, 1 луковицу; гвоздики, перцу, лаврового листа, соли, сахара по вкусу и очищенных нарезанных разных кореньев 50 грамм.—Смешав уксус с водой, кладут в него все пряности, кипятят под крышкой, затем остуживают и заливают баранину на несколько часов или на всю ночь, смотря по величине куска.

Как улучшить вкус сала.

В крестьянских хозяйствах часто вместо коровьего масла употребляют сало, которое все-таки обладает некоторым неприятным привкусом, когда не особенно хорошо и чисто вытоплено. Чтобы улучшить вкус сала и сделать его похожим на масло, надо поступать так: хорошо промытый и очищенный говяжий или бараний жир нарезать мелкими кусочками, сложить в кастрюлю или чугунок и залить молоком. Потом поставить в печь после топки, дать хорошо прокипеть, процедить сквозь редкую тряпочку, вышкварки употребить на поджаривание картофеля, а процеженное сало слить в горшок и хранить в холодном месте.

Выдавец—**Аддзел работніц і сялянак ЦК КП(б)Б.** *Рэдактары:* **С. Крэмер, М. Мэерзон.**

МОДЫ

УЗОРЫ ЖЕНСКИХ ПЛАТЬЕВ

627. Платье из бумажной или шерстяной материи. Юбка отрезная, заложена в складку, вверху складки заканчиваются вышитыми квадратами. Шерсти 3½ метра.

628. Юбка из бостона или иного материала, кроится прямая, сзади 2 выточки. Материи 1¾ метра.

629. Юбка из клетчатого материала, отделка из гладкого. Материи 1¾ метра.

630. Юбка из темной шерсти, отделана суташем. Материи 1¾ метра.

631. Платье из шерстяной или бумажной материи, кроится отрезное. На юбке по бедрам настрочены три пояса. Материи 3 метра.

632. Платье из двух материй. Темной материи 1½, светлой 2 метра.

ЦЕНА В РОЗНИЦУ—20 КОП.

СО СЛЕДУЮЩИМ НОМЕРОМ БУДЕТ РАЗОСЛАНА ВЫКРОЙКА.

ЧТО ЧИТАТЬ

К МЕЖДУНАРОДНОМУ ДНЮ РАБОТНИЦ:

Ленин—Международный день работниц. **Благоева**—История 8-го марта. **Калыгина**—Крестьянка и 8-е марта. **Крупская**—Великая годовщина. **Боярская**—Женщина под гнетом капитала. **Граевская**—Как Советская власть охраняет здоровье матери и ее ребенка (на бело русск. языке). **Богат**—Работницы и крестьянки на страже, СССР с дополнениями **Грынева** (на белорусском языке.)

Выходит из печати пьеса Сташевского **„Катерина“** на белорусском языке, которая была помещена в № 10 „Беларускай Работніцы і Сялянкі“. Пьеса рекомендуется к постановке для крестьянок.



Вышивка крестом

КУДА ЖАЛОВАТЬСЯ

КОГДА НЕ ПОЛУЧАЕТСЯ ЖУРНАЛ.

Если хотите получить журнал в том-же месяце, в котором подписались, сдайте подписку своевременно, не позже 10-го числа.

Если же подписка сдана своевременно, а журнал не получен, нужно навести справки там, где сдана подписка. В случае неудовлетворительного ответа жалуйтесь в редакцию или непосредственно в Минскую почтовую контору, указав № квитанции, где была сдана подписка и на какой срок (если нет квитанции—достаточно указать, где сделана подписка и на какой срок).

РАБОТНИЦЫ И КРЕСТЬЯНКИ!

ПРИНИМАЕТСЯ ПОДПИСКА на ежемесячный журнал „БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА“—орган Отдела работниц и крестьянок ЦК КПБ.

Журнал выходит на белорусском и русском языке при активном участии самих работниц и крестьянок.

В ЖУРНАЛЕ: популярные статьи политического и бытового характера, рассказы, стихи, письма работниц и крестьянок Белоруссии, письма зарубежных работниц и крестьянок.

Условия подписки:

На год . . .	1 р. 80 к.	На 3 м-ца . . .	45 к.
На 6 м-цев . .	90 к.	На 1 м-ц. . . .	15 к.

Цена отдельного номера—20 коп.

Каждые три месяца—приложение—выкройка.

ПОДПИСАТЬСЯ МОЖНО: в редакции, в любом почтовом отделении, в отделениях „Известий“ и „Правды“.

КАКИЕ ЖУРНАЛУ НУЖНЫ ФОТОГРАФИИ.

ЖУРНАЛ „БЕЛАРУСК. РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА“ богато иллюстрированный. Кроме рисунков лучших художников, широко использовываются фотографии, отображающие жизнь и работу работниц и крестьянок всех уголков Белоруссии.

Но много из присылаемых фотографий не использовываются, обыкновенные группы—совсем не интересно печатать. Для журнала нужны фотографии работниц и крестьянок за работой, в производстве, в сельском хозяйстве, в кружках, на общественной работе.

Фотографии должны быть чистыми и выразительными. Использованные—редакцией оплачиваются.



Вышивка крестом